Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МККП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 228 (5902) | 3 кастрычніка 1937 г., нядзеля | ЦАНА 10 КАП.

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся

2. Всесоюзная библиотека

СЕННЯ У НУМАРЫ:

ПЕРАДАВЫ АРТЫКУЛ — Несці большэвіцкае слова ў масы.

АРТЫКУЛЫ:

Р. Вольскі. — Да выбараў у Вярхоўны Совет СССР. — Парадак галасавання. — 2 стар.

Аграном Бабіцкі. — Абмеркаванне праекта правільных севазваротаў. — Аб севазваротах у соўгасах. — 3 стар.

Логінаў. — Справы кіраўнікоў Нараўлянскага раёна. — 3 стар.

А. Далін — Калгасная архітэктура.

Перадкастрычніцкае социялістычнае спаборніцтва.

Новыя атрады працоўных уключаюцца ў спаборніцтва. — 2 стар.

Пільныя вартавыя совецкіх рубяжоў. Эпізод на граніцы. — 4 стар.

ЗА РУБЯЖОМ:

На франтах у Іспаніі.

Адкрылася сесія іспанскага парламента.

Рэспубліканская Іспанія рыхтуецца да святкавання 20-й гадавіны Кастрычніка.

Ваенныя дзеянні ў Кітаі.

Ліга нацый аб падзеях у Кітаі.

НЕСЦІ БОЛЬШЭВІЦКАЕ СЛОВА Ў МАСЫ

З велізарным натхненнем і інтарэсам працоўныя рэспублікі вывучаюць «Палажэнне аб выбарах у Вярхоўны Совет». На сходах, у гуртках яны задаюць дзесяткі пытанняў, жыва цікавячыся і адрозненнем выбарчага закона СССР ад выбарчых законаў капіталістычных краін і практычнымі пытаннямі правядзення выбараў. Амаль на ўсіх сходах працоўныя патрабуюць інфармацыі аб тым, як вядзецца падрыхтоўка да выбараў у Вярхоўны Совет у рэспубліцы. Гэтыя пытанні сведчаць аб узрослай актыўнасці працоўных мас. У гэтых пытаннях праяўляецца велізарны рост свядомасці рабочых і сялян і іх клопаты аб сваёй народнай дзяржаве.

На прадпрыемствах, ва ўстановах і жактах Менска працуе 850 гурткоў, у якіх займаюцца вывучэннем «Палажэння аб выбарах» і Сталінскай Канстытуцыі 25 тысяч чалавек. У горадзе Віцебску створана 75 выбарчых участкаў. На ўсіх прадпрыемствах, установах і жактах працуюць гурткі. 55 старшынь секцый і дэпутацкіх груп працуюць у семінары прапагандыстаў.

На дрэзаапрацоўчым камбінаце ў Бабруйску арганізавана 40 гурткоў, дзе 800 рабочых вывучаюць «Палажэнне аб выбарах».

Больш тысячы рабочых крычаўскага цементнага завода займаюцца ў гуртках. 23 агітатары завода праводзяць палітычную работу на кватэрах з сем'ямі рабочых і т. д.

Гэты нябачаны размах прапагандысцкай работы ўсё-ж незадавальняе насельніцтва. Усе, нагалоўна ўсе, хочуць ведаць закон і Сталінскую Канстытуцыю. Гэта жаданне нашы партыйныя арганізацыі, совецкія, профсаюзныя і комсамольскія органы абавязаны задаволіць. Большэвіцкае слова павінна пранікнуць ва ўсе слаі насельніцтва, у тым ліку, і да так званага неарганізаванага насельніцтва. Нават у Менску, у сталіцы Беларусі гэта патрабаванне яшчэ далёка незадавальняецца. Гурткамі ахоплена ўсяго толькі 12 проц. насельніцтва. Гэта кропля ў моры. Няма сумнення, што ў іншых гарадах рэспублікі процант ахопу насельніцтва нашай прапагандысцкай работай яшчэ меншы.

Шырокаму разгортванню работы перашкаджаюць небольшэвіцкія адносіны да вылучэння кадраў агітатараў. Знаходзяцца яшчэ такія кіраўнікі, якія гаворыць аб недахопе кадраў агітатараў і прапагандыстаў, не бачучы велізарнейшай колькасці вылатных агітатараў з рабочых, калгаснікаў, служачых і совецкай інтэлігенцыі. Не заўважаюць гэтыя кіраўнікі тысячы вылатных людзей, якія штодзённа нясуць слова аб Канстытуцыі мільёнам працоўных, слова, сказанае задушэўна і проста, сказанае іменна так, як трэба гаварыць з працоўным, — з совецкім выбаршчыкам. Гэтыя кадры не ўлічваюцца іх абыходзяць міма, іх работу ніхто не накіроўвае, ніхто ім не дапамагае. Адносіны да гэтых кадраў трэба неадкладна змяніць. Нам трэбны дзесяткі тысяч агітатараў, каб абслужыць усё насельніцтва, каб кожнаму працоўнаму зразумела расказаць і растлумачыць «Палажэнне аб выбарах».

Наша слова павінна быць вострым, узбройваючым працоўных для барацьбы з ворагамі народа, навучаючым масы распазнаваць ворагаў і граміць іх.

Ворагі народа ў Беларусі прынеслі шмат няшчасняў працоўным. Яны паказалі сябе як ненавіснікі і каты беларускага народа. Польскія шпікі, дыверсанты і школнікі, трацкісцкія і бухарынскія бандыты нанеслі вялікую шкоду гаспадарцы Беларусі. Самую ізуверскую сістэму здзекаў выдумвалі яны і праводзілі, каб выклікаць незадавальненне мас. Зараз ахвосце гэтай развеянай совецкім народам банды шпікоў, дыверсантаў і школнікаў развівае алчаўную дзейнасць, рыхтуючыся да выбараў у Вярхоўны Совет. Подлую варожую работу вядуць царкоўнікі. Граючы на адсталых пачуццях некаторых слаёў насельніцтва, запалохваючы іх, банды ў расах развіваюць шалёную агітацыю. А там-сям ужо інспэніруюць выбары.

Сваім большэвіцкім словам мы павінны разбіць хітры манеўр ворага. Наша слова, гарачае большэвіцкае слова, павінна развеяць ушчэнт планы гэтых мярзотнікаў. Усю праўду мы павінны расказаць працоўным аб фашызме, аб верных сабаках фашызма, арудаваўшых на тэрыторыі Беларускай рэспублікі. Усю праўду мы павінны расказаць і аб тым, як фальшыва буржуазная дэмакратыя, і аб тым, што нават гэту жалкую і наскрозь фальшывую буржуазную дэмакратыю, служачую заціскальнікам улады капітала, зараз фашысты адабралі ў працоўных, знішчылі, запрыгожваючы рэакцыю па ўсёй лініі. Гэтаму змроку рэакцыі мы павінны процістаўіць тую любоў і клопаты аб людзях, якой прасякнут кожны артыкул Сталінскай Канстытуцыі і «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет» нашай шудоўнай радзімы.

«Цяпер, — гаворыць таварыш Сталін, — калі мутная хваля фашызма аплёўвае социялістычны рух рабочага класа і змешвае з граззю дэмакратычныя ўстрэмленні лепшых людзей цывілізаванага свету, новая Канстытуцыя СССР будзе абвінавачвацца актам супроць фашызма, гаворачым аб тым, што социялізм і дэмакратыя непераможны (апладысменты). Новая Канстытуцыя СССР будзе маральнай дапамогай і рэальным пашпарт'ем для ўсіх тых, хто вядуць зараз барацьбу супроць фашысцкага варварства. (Бурныя апладысменты).

Яшчэ большае значэнне мае новая Канстытуцыя СССР для народаў СССР. Калі для народаў капіталістычных краін Канстытуцыя СССР будзе мець значэнне праграмы дзеянняў, то для народаў СССР яна мае значэнне выніку іх барацьбы, выніку іх перамог на фронце вызвалення чалавецтва. У рэзультаце пройдзенага шляху, барацьбы і лішэнняў прыемна і радасна мець сваю канстытуцыю, трактуючую аб пладах нашых перамог. Прыемна і радасна ведаць, за што біліся нашы людзі і як яны дабіліся сусветна-гістарычнай перамогі. Прыемна і радасна ведаць, што кроў, багата пралітая нашымі людзьмі, не прайшла дарма, што яна дала свае вынікі». (Прапяжныя апладысменты).

Мы яшчэ зусім не зыкарысталі ўсіх магчымасцей і форм агітацыі і прапаганды Сталінскай Канстытуцыі і «Палажэння аб выбарах». Арганізацыя гурткоў справа вельмі добрая і яе ўсяляк трэба заахвочваць. Гурток дае патлыбленае вывучэнне. У гэтым іх мэта. Наша партыя і ўрад зацікаўлены ў тым, каб совецкі выбаршчык добра ведаў Канстытуцыю і «Палажэнне аб выбарах». Аднак гурткі не адзіная форма вывучэння гэтых сусветна гістарычных дакументаў. Для вывучэння гэтых дакументаў трэба выкарыстаць усе рознастайныя формы большэвіцкай агітацыі і прапаганды. Для гэтай мэты трэба выкарыстаць таксама тэатры, кіно, клубы, хаты-чытальні, чырвоныя куткі, насценныя газеты, шматтыражкі і т. д. Ці можна іх выкарыстаць? Можна і патрэбна. Трэба толькі прыкласці большэвіцкую руку, энергію, старанасць, ініцыятыву, і справа большэвіцкай агітацыі і прапаганды ў нас пойдзе рушыць наперад.

Алчытваўшыяся днямі на нарадзе па падрыхтоўцы да выбараў у Вярхоўны Совет СССР сакратар Слуцкага акругкома КП(б)Б таз. Нікішін, сакратар Магілеўскага гаркома КП(б)Б тав. Хрышач, сакратар Чавускага РК КП(б)Б тав. Геўрусёў і Лёзянскага—т. Бугроў, як відаць, з іх дакладаў не скарысталі яшчэ ўсіх сродкаў і форм большэвіцкай агітацыі і прапаганды «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет». А гэта пара ўжо зрабіць. Пара пусціць у ход усю шматтысячную армію агітатараў і прапагандыстаў. Пара разгарнуць усе формы агітацыі і прапаганды.

Гэтым таварышам мы павінны нагадаць наступныя ўказанні таварыша Сталіна.

«Калі народ, — гаворыць таварыш Сталін, — там-сям і выбірае варожых людзей, то гэта будзе азначаць, што наша агітацыйная работа пастаўлена з рук вон дрэнна, і мы ўпаўне заслужылі такую ганьбу, калі-ж наша агітацыйная работа будзе ісці па-большэвіцку, то народ не прапусціць варожых людзей у свае вярхоўныя органы. Значыцца трэба прапавань, а не хныкаць (бурныя апладысменты), трэба прапавань, а не чакаць таго, што ўсё будзе прадастаўлена ў гатовым выглядзе ў парадку адміністрацыйных распараджэнняў».

Прапаганда і агітацыя Сталінскай Канстытуцыі і «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет» і з'яўляецца важнейшай работай у сістэме падрыхтоўкі да выбараў у Вярхоўны Совет і ўсенароднай урачыстасці працоўных—XX галавіны Вялікай Кастрычніцкай социялістычнай рэволюцыі. Гэту работу трэба разгортваць неадкладна. Прапаганда гэтых сусветна гістарычных дакументаў—кроўная справа большэвікоў партыйных і непартыйных

НА СТАНЦЫІ „ПАЎНОЧНЫ ПОЛЮС“

2 кастрычніка ў 13 гадзін станцыя «Паўночны полюс» знаходзілася на 85 град. 28 мін. паўночнай шыраты і 3 град. 37 мін. усходняй даўгаты. Бачнасць была 500—1000 метраў. Ішоў вялікі снег. Дуў чатырохбальны паўднёвы вецер. Тэрмометр паказваў мінус 15 градусаў.

***

У гэты-ж час над востравам Рудольфа была супэльная воблачнасць. Воблакі ішлі на вышыні 300 метраў. Бачнасць — ад 1 да 2 кіламетраў. Ішоў умераны снег. Дуў паўночна-заходні вецер сілаю ў 1 бал. Тэмпература — 9 градусаў ніжэй нуля. (БЕЛТА).

КАНФЕРЭНЦЫЯ КОМСАМОЛА СТАЛІНСКАГА РАЁНА

Учора ў Вялікай зале Дома партактыва адкрылася другая канферэнцыя комсамола Сталінскага раёна гор. Менска.

Пад бурныя апладысменты і гарачыя авацыі дэлегаты канферэнцыі паслалі прывітанне правадыру народаў Вялікаму Сталіну і першаму маршалу СССР тав. Варашылаву.

Сёння канферэнцыя прапягвае сваю работу з 10 гадзін раніцы. Дэлегаты заслухалі справаздачу райкома комсамола.

НА ФРАНТАХ У ІСПАНІІ

УСХОДНІ (Арагонскі) ФРОНТ

1 кастрычніка рэспубліканцы занялі ў сектары Хака 2 вышыні і 3 насельных пункты. Спробы праціўніка прасунуцца ў напрамку на ўсход ад Ібор былі адбіты. Мяцежнікі адступілі ў беспарадку.

ПАЎНОЧНЫ ФРОНТ

Ва ўсходнім сектары мяцежнікі пасля моцнай артылерыйскай падрыхтоўкі заняслі некалькі вышынь на паўночны захад ад Пеньяверлэ. Пад націскам пераважных сіл мяцежнікаў рэспубліканцы змушаны былі пакінуць пазіцыі на Сіера Эскапада і гару Ігоўдо.

Авіяцыя мяцежнікаў 30 верасня і 1 кастрычніка не раз бамбардыравала Хіхон. Кожны раз рэспубліканскія знішчальнікі адганялі самалёты мяцежнікаў. Два самалёты мяцежнікаў былі збіты, адзін упаў у мора, другі — у межах размяшчэння мяцежнікаў.

МАДРЫДСКІ ФРОНТ

У ноч на 1 кастрычніка мяцежнікі атакавалі пазіцыі рэспубліканцаў на паўночны захад ад Мадрыда з мэтай перашкодзіць фартыфікацыйным работам урадавых войск, прадстаўляючым сур'ёзную пагрозу для мяцежнікаў. Рэспубліканская цяжкая артылерыя адкрыла агонь па ходах зносін мяцежнікаў і перашкодзіла прыбыццю падмацаванняў атакуючым часцям. Дасягнуўшы драпяных загарод, мяцежнікі былі ўзяты пад скрыжаваны кулямётны агонь і вымушаны ў беспарадку адступіць, панёсшы вялікія страты.

***

1 кастрычніка тры эскадрыллі мяцежнікаў бамбардыравалі Барселону, потым, знізіўшыся, расстрэльвалі з кулямётаў мірных жыхароў, у тым ліку групу школьнікаў.

Бамбардыроўкай разбурана 34 дамы, забіта 45 чал. і ранена 87. (БЕЛТА).

АДКРЫЦЦЁ СЕСІІ ІСПАНСКАГА ПАРЛАМЕНТА

ПАРЫЖ, 1 кастрычніка. Агенцтва Гавас паведамляе, што сёння ў выключна ўрачыстай абстаноўцы адкрылася сесія іспанскіх картэсаў (парламента).

Усё насельніцтва Валенсіі вышла на вуліцы і плошчы, каб вітаць сесію і выказаць свае сімпатыі і ўдзячнасць дэпутатам картэсаў.

Адкрываючы сесію, старшыня картэсаў Мартынес Барыо свае першыя словы прысвяціў «слаўнай рэспубліканскай арміі, якая змагаецца гераічна на ўсіх франтах».

«Прывітанне, якое перадае нашай арміі парламент, — заявіў Мартынес Барыо,— гэта прывітанне ад усёй нашай краіны. Іспанія прадстаўлена тут поўнасцю. Роднасць у поглядах, якая можа нас раздзяліць, знікае ў гэтыя гістарычныя моманты, якія мы перажываем і пад знакам якіх сабраўся парламент. Я спадзяюся, што мы ўсе прымем на сябе тую адказнасць, якую на нас усклалае краіна».

Прамова Барыо была пакрыта авацыяй прысутных.

Пасля сканчэння прамовы Барыо сесія зацвердзіла рад законапраектаў, у тым ліку законапраект аб прадоўжанні надзвычайнага становішча на ўсёй тэрыторыі рэспубліканскай Іспаніі.

Потым слова атрымаў старшыня совета міністраў Хуан Негрын, які заявіў: «Наступленне італьянцаў на поўначы, контрнаступленне рэспубліканскіх войск на арагонскім фронце і першачарговай важнасці работа, звязаная з пленумам Лігі нацый, не дазволіла нам, на жаль, прысвяціць столькі часу, колькі мы гэтага хацелі, вывучэнню розных пытанняў, якія падлягаюць абмеркаванню парламента». Далей Негрын спыніўся на рабоце ўзначальваемага ім урада і заявіў: «Мы аднадушна жадаем міру, такога міру, які гарантаваў-бы нам парадак, справядлівасць і нашу незалежнасць. Мы жадаем міру, які гарантаваў-бы нашаму народу магчымасць ажыццявіць праз свае дэмакратычныя ўстановы той эканамічны і социяльны лад, якога жадае наш народ».

ДЭКЛАРАЦЫЯ ІСПАНСКАГА ЎРАДА Ў ПАРЛАМЕНЦЕ

ВАЛЕНСІЯ, 1 кастрычніка. (БЕЛТА). Сёння на першым пасяджэнні картэсаў (парламент) прэм'ер Негрын, сустрэты авацыяй, агласіў урадавую дэкларацыю. Негрын указаў, што задача ўрада не толькі выйграць вайну, але і дабіцца ўмацавання свабоды і незалежнасці Іспаніі. Іспанія, заявіў Негрын, не дапусціць ніякага ўмяшання ў яе справы. Яна ўправе патрабаваць падтрымкі іншых краін, каб адбіць напад, афярай якога яна стала. Справа ідзе не аб заенным мяцежы, але аб сапраўднай вайне, выкліканай і падрыхтаванай фашысцкімі краінамі, якія презіраюць усе міжнародныя законы.

Выйграшь вайны, — гаворыцца ў дэкларацыі, — гэта не толькі пытанне аб тым ці іншым рэжыме. Гэта пытанне аб тым, быць ці не быць Іспаніі.

Перайшоўшы да пытання аб ахове грамадскай бяспечнасці ў тылу, Негрын указаў, што ў замежных пасольствах укрываюцца тысячы фашыстаў. Урад гатоў згадзіцца на эвакуацыю жанчын і дзяцей, але не можа згадзіцца і ніколі не згодзіцца на эвакуацыю ўсіх укрыўшыхся ў пасольствах, як гэта прапанавалі ў Жэневе прадстаўнікі некаторых краін. Урад паведаміў, што ён гатоў гарантаваць асабістую недатыкальнасць тым з схаваўшыхся ў замежных пасольствах, хто не парушыў іспанскіх законаў, і не караць смерцю тых, хто сам па добрай волі з'явіцца на суд. Іншых абавязацельстваў урад прыняць не можа.

Урад прадаўжае ўмацоўваць народную армію. Ён не знаходзіць слоў, каб выказаць сваё пракланенне перад гераічнымі байцамі Астурыі. Падзенне Більбао і Сантандэра, зыкліканае пераважагай сілі праціўніка, было цяжкім ударам. Аднак рэспубліканскае наступленне пад Сеговіей, пад Мадрыдам і ў Арагоніі ўвянчалася поспехам. Армія адчувае недахват кадраў і труднасці, звязаныя з быстрай арганізацыяй дастаткова магутных сіл. Аднак армія, несумненна, на прапягу некалькіх месяцаў стане настолькі моцнай і арганізаванай, што рэспубліка зможа прадпрыняць наступленне на ўсіх франтах.

Далей Негрын перайшоў да знешняй палітыкі Іспаніі і выказаў удзячнасць Совецкаму Саюзу.

— З усімі краінамі, апрача непрызнаючых нас, Іспанія падтрымлівае нармальныя адносіны. Аднак ёсць дзве краіны, інтарэсы якіх процілеглы міжнародным. Гэтыя краіны ўмешваюцца ў справы Іспаніі.

Негрын закончыў дэкларацыю заявай аб поўнай упэўненасці ўрада ў перамозе.

— Іспанія пераможа, — сказаў ён, — бо барацьба ідзе не на жыццё, а на смерць за існаванне ўсяго іспанскага народа.

Пасля агалашэння дэкларацыі Пенья ад імя социялістычнай партыі, і Велас— ад «рэспубліканскай левай» заявілі аб безагаворачнай падтрымцы ўрада.

ФАШЫЗМ РЫХТУЕЦЦА ДА ВАЙНЫ СУПРОЦЬ ГЕРМАНСКАГА НАРОДА

ПРАГА, 1 кастрычніка. (БЕЛТА). Социял-дэмакратычная газета «Нейес форвертс» апублікавала сакрэтны даклад начальніка Гестапо і кіраўніка ахранных атрадаў (СС) Гімлера вышэйшаму камандванню германскай арміі.

Гімлер адкрыта заяўляе, што ў будучай вайне фашызм будзе мець фронт не толькі на сушы, на моры і ў паветры, але і «чацверты фронт» — у самой Германіі.

Прыводзячы факты, якія сведчаць аб узмацненні падпольнай дзейнасці германскай комуністычнай партыі і антыфашысцкіх арганізацый, Гімлер высоўвае на першы план задачу барацьбы з «чацвертым фронтам». Для гэтага, па думцы Гімлера, неабходна ўзмацніць тэрор супроць комуністаў і іншых прапіўнікаў фашысцкай дыктатуры і неадкладна пашырыць сетку канцлагераў.

«Калі мы хочам агарадзіць сябе ад непрыемных сюрпрызаў у час вайны, — заяўляе Гімлер, — мы павінны будзем вялікую колькасць асоб заключыць у турму».

Другая задача Гестапо — вербаваць шпёнаў і правакатараў сярод арыштаваных.

Потым Гімлер лічыць неабходным стварыць з адборных часцей «СС» так называемыя «ударныя атрады смерці», агульнай колькасцю ў 25 тысяч чалавек. Гэтыя атрады будуць сфармаваны ў першую чаргу з фашысцкай аховы канцлагераў, праверанай на варварскіх метадах абыходжання з палітзняволенымі.

РАСПРАВА З АНТЫФАШЫСТАМІ Ў ПОЛЬШЧЫ

ВАРШАВА, 29 верасня. (БЕЛТА). «Газета польска» паведамляе, што выязная сесія Люблінскага акруговага суда ў Краснастаўцы прыгаварыла 20 чал. да розных тэрмінаў турэмнага зняволення ад 2 да 6 год—па абвінавачванню ў прыналежнасці да компартыі Заходняй Украіны.

Аднадасова выязная сесія Віленскага акруговага суда ў Валейцы прыгаварыла 2-х чалавек па абвінавачванню ў рэволюцыйнай дзейнасці, аднаго да 4 і другога да 8 год турэмнага зняволення.

ЯПОНСКІЯ ПАРАХОДЫ Ў КОШТ УПЛАТЫ ЗА КВЖД

ТОКІО, 1 кастрычніка. (БЕЛТА). Агенцтва Домей Цусін паведамляе, што на судабудаўнічых верфях «Урага док компані» закончана пабудова чатырох параходаў для СССР у кошт уплаты за КВЖД. (Кітайска-Усходнюю чыгунку). Два параходы маюць водазмяшчэнне па 720 тон кожны і два — па 500. Параходы ў бліжэйшыя дні будуць адпраўлены ў Владівасток з совецкімі камандамі, якія ўжо прыбылі ў Іокагаму (японскі порт).

ВІЛЕТНІКАВА Е. П. — ордэнаносец, былы дыспетчар Гомельскага аддзялення, зараз назначана начальнікам пасажырскай службы Беларускай чыгункі.
Фото Шаевіча А. (БСФ).

РЭСПУБЛІКАНСКАЯ ІСПАНІЯ РЫХТУЕЦЦА ДА СВЯТКАВАННЯ XX-ГОДДЗЯ КАСТРЫЧНІКА

ВАЛЕНСІЯ, 1 кастрычніка. (БЕЛТА). Усеіспанскай камісіяй па правядзенню святкавання XX-годдзя Вялікай Социялістычнай Рэволюцыі ў СССР прынята адозва да ўсіх антыфашыстаў Іспаніі.

«Увесь свет, — указваецца ў адозве,— ушаноўвае СССР за яго дасягненні ў социялістычным будаўніцтве, за яго няўхільную абарону міру. Але мы, іспанцы, больш чым які другі народ маем падставу выказаць нашу дружбу і ўдзячнасць Совецкаму Саюзу за тое, што яго народы праявілі найглыбейшую салідарнасць з намі ў часе нашай барацьбы за свабоду.

Таму ўсе профсаюзныя і палітычныя арганізацыі, усе антыфашысцкія групы, сапраўдныя прадстаўнікі нашай краіны аб'ядналіся для таго, каб засведчыць народам Совецкага Саюза сваю дружбу, любоў і захапленне».

Усеіспанская камісія зварачаецца да ўсіх іспанцаў з заклікам прыняць актыўны ўдзел у святкаванні XX-годдзя Вялікай Социялістычнай Рэволюцыі.

НОВАЕ КІРАЎНІЦТВА ПРОФСАЮЗАМІ ІСПАНІІ

ВАЛЕНСІЯ, 2 кастрычніка. (БЕЛТА). За апошні час выканком ВРС (Усеагульны рабочы саюз), які ўзначальваўся Ларго Кабальеро, не аллюстроўваў лініі большасці профсаюзных арганізацый, уваходзячых у ВРС. Больш таго, выканком ВРС выключыў з саюза рад профсаюзных арганізацый за няўплату членскіх узносаў, у прыватнасці профсаюз астурыйскіх гарнякоў. У сувязі з гэтым 30 профсаюзных арганізацый, прадстаўляючых пераважную большасць членскіх мас ВРС, патрабавалі неадкладнага склікання пасяджэння нацыянальнага камітэта (пленума) ВРС. Не гледзячы на супраціўленне старога кіраўніцтва выканкома ВРС, нацыянальны камітэт быў склікан 1 кастрычніка і аднагалосна выбраў новы склад выканкома ВРС, у склад якога ўвайшлі: Пенья (старшыня), Домінгес (віце старшыня) і Вега (генеральны сакратар).

Нацыянальны камітэт ВРС выказаў безагаворачна падтрымліваць урад народнага фронта на чале з Негрынам і паслаў прывітальныя тэлеграмы Каталонскаму ВРС і НКТ (Нацыянальная канфедэрацыя працы).

ФРАНЦЫЯ ВЫСЫЛАЕ ІСПАНСКІХ БЕЖАНЦАЎ

ПАРЫЖ, 2 кастрычніка. (БЕЛТА). Як паведамляе агенцтва Гавас, міністр унутраных спраў Дормуа заявіў, што, па ўзгадненню з іспанскім урадам, іспанскія бежанцы, што знаходзяцца ва Францыі, накіроўваюцца ў Іспанію. Дормуа заявіў, што ўтрыманне 55 тысяч бежанцаў абыходзіцца штодзень у 1 мільён франкаў і кладзецца вялікім цяжарам на французскі бюджэт.

Учора першая партыя бежанцаў (1.500 чалавек) была адпраўлена ў рэспубліканскую Іспанію.

У сувязі з гэтым «Юманітэ» піша, што высылаюцца толькі беднякі, тады як іспанскім багацеям, якія з'яўляюцца шпёнамі Франко і германскай Гестапо, дазваляецца аставацца ва Францыі.

„СВЯТА“ АШУКАНСТВА І ФАШЫСЦКАЙ ДЭМАГОГІІ

БЕРЛІН, 1 кастрычніка. (БЕЛТА). Трэцяга кастрычніка на гары Бюкерберг (недалёка ад Ганавера) кожны год адбываецца праводзімае германскімі фашыстамі так званае «свята ўраджаю». Як і ўсе іншыя фашысцкія святкаванні гэты дзень будзе адзначан новымі ваеннымі віда-вішчамі ў спалучэнні з фашысцкай дэмагогіяй.

Адна з задач святкавання—спроба скрыць ад шырокіх мас насельніцтва сумныя вынікі сельскагаспадарчага года ў «Трэцяй імперыі». Нават афіцыяльная германская статыстыка вымушана прызнаць, што ўраджай гэтага года па асноўных зажнейшых культурах значна ніжэй леташняга. Па прызнанню кіраўніка па выкананню славутай фашысцкай «чатырохгодкі падрыхтоўкі вайны» Герынга, германская сельская гаспадарка недалае 17 проц. спажываемых краінай сельскагаспадарчых прадуктаў. Германская вытворчасць тлушчаў пакрывае толькі 45 — 50 проц. патрэбнасці. Выданы германскім урадам закон аб абавязковай здачы ўраджаю, які пазбаўляе сялян усякага права самастойнага распараджэння прадуктамі ўласнай вытворчасці, наштурхоўваецца на глухое, але ўпартае супраціўленне вёскі. Гэта супраціўленне праяўляецца, не гледзячы на ўсе пагрозы.

ВЕЛІЗАРНЫ ПОСПЕХ ЧЫРВОНАСЦЯЖНАГА АНСАМБЛЯ Ў ПРАЗЕ

ПРАГА, 30 кастрычніка. (ТАСС). Учора адбыўся другі канцэрт Чырвонаспяжнага ансамбля чырвонаармейскай песні і танца.

Перапоўненая зала рэагавала на выступленне ансамбля яшчэ больш бурна, чым у першы вечар. Кожны нумар даводзілася выконваць па два-тры разы. Публіка падоўгу і дружна апладзіравала прафесару Александраву, асобным салістам і ўсяму ансамблю.

Поспех другога канцэрта — выключны. Вечар выліўся ў супэльную авацыю па адрасу таленавітых выхаванцаў слаўнай Чырвонай Арміі. Гэта быў сапраўдны трыумф совецкага харавога мастацтва і дэманстрацыя дружбы і сімпатый розных слаёў чэхаславацкага народа да СССР.

Усе газеты поўны самых захапляючых водзываў аб майстэрстве ансамбля.

Найбольш яркую характарыстыку поспеху ансамбля дае газета «Рудэ право».

«Так, гэта быў сапраўдны трыумф! — піша газета. — Сваім майстэрствам ансамбль чырвонаармейскай песні і танца захапіў нашы сэрцы, выклікаў сярод розных катэгорый публікі захапленне і зачараванне краінай, якая яго выхавала. Гэта — мастацтва, якое сапраўды б'е крыніцай, у выкананні таленавітых майстроў — мастакоў, якія выйшлі з нетраў народа, расцвілі пад сонцам социялістычнай свабоды».

ПЕРАДКАСТРЫЧНІЦКАЕ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ СПАБОРНІЦТВА

НОВЫЯ АТРАДЫ ПРАЦОУНЫХ УКЛЮЧАЮЦЦА Ў СПАБОРНІЦТВА

РЫХТУЮЦЦА ДА СВЯТА

Зварот калгаснікаў сельгасарцелей імя Дзержынскага і «Чырвоны хлебароб» аб разгортванні перадкастрычніцкага спаборніцтва знайшоў жывы водгук сярод калгаснікаў Полацкага раёна. Члены арцелі імя Першага з'езда калгаснікў-ударнікаў актыўна ўключыліся ў перадкастрычніцкае спаборніцтва.

Калгас у гэтым годзе атрымаў высокі ўраджай. Кожны гектар жыта дае ў сярэднім 18 цэнтнераў зярна, а ўраджай бульбы даходзіць да 300 цэнтнераў.

Уключыўшыся ў перадкастрычніцкае спаборніцтва, калгаснікі ўзялі канкрэтныя абавязацельствы: у бліжэйшыя дні кончыць зяблевае ворыва. Больш паловы пад зяблева ўжо ўзарана. Уборку бульбы мяркуюць скончыць не пазней 5 кастрычніка. Калгас і калгаснікі першымі па раёну яшчэ ў жніўні разлічыліся з дзяржавай па бульбапастаўках. На ўборцы бульбы працуюць лепшыя калгасніцы, якія спаборнічаюць паміж сабой.

Да свята ў калгасе будзе поўнасцю скончан абмалот і засыпка насенных фондаў. Калгаснікі абавязаліся здаць дзяржаве лён не пазней 15 кастрычніка. Большасць трасты паднята са спелішч. Калгас ужо здаў на ільназавод 873 кілограмы трасты. На сартаванні штодзень працуюць 17 калгаснік.

Разгорнута перадкастрычніцкае спаборніцтва ў калгасе «Чырвоная Сякераўшчына», Громаўскага сельсовета. Багаты ўраджай поўнасцю сабран і беражліва ахоўваецца. На працадні калгаснікі атрымліваюць у азанс па кілограму жыта, 11 кілограмаў бульбы, 3 кілограмы грубых кармоў і 1 р. 25 к. грашыма. Сям'я калгасніка Бондарава за 9 месяцаў мае 700 працадзён. Яна атрымлівае авансам 700 кілограмаў збожжа, 875 руб., 2.100 кілограмаў сена і 7.700 кілограмаў бульбы. Да пачатку размеркавання прыбыткаў гэта лічба значна ўзрасце.

Палова бульбы ў калгасе ўжо выбрана з поля. На ўборцы працуюць лепшыя звенні капальшчык. Да 5 кастрычніка калгаснікі абавязаліся кончыць капанне бульбы і ворыва зяблева.

Калгаснікі Таранкоў Хведар і Секалаў Аляксей да свята канчаюць будаўніцтва новых хат. Калгаснікі рамантуюць свае хаты.

Добры ўраджай атрымалі сёлета калгаснікі калгаса імя Кірава, Экіманскага сельсовета. Атрымаўшы авансы, калгаснікі набываюць да свята каштоўныя рэчы. Калгаснік Юшкевіч купіў для сваёй сям'і новае святочнае адзенне. Многія калгаснікі маюць на мэце купіць да свята канапы і іншыя хатнія рэчы.

Ал. ЖЫХАРАЎ.

Калгаснікі Віцебскага раёна хутка адгукнуліся на зварот калгаснікаў калгасаў імя Дзержынскага, Лагойскага раёна, і «Чырвоны хлебароб», Гомельскага раёна, аб перадкастрычніцкім соцспаборніцтве калгасаў БССР. НА ЗДЫМКУ: брыгадзір калгаса «Звязда» тав. Аляксеенка П. Н. чытае сваёй брыгадзе зварот гэтых калгасаў. Брыгада тав. Аляксеенка заключыла соцдагавор з брыгадай тав. Карначова гэтага-ж калгаса.
Фото Лупейка (БСФ).

АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВЫ ВЫКАНАЕМ

Наша фабрыка імя Куйбышэва за першае паўгоддзе выканала план на 107,5 проц. Але гэта не значыць, што ў нас усё добра.

У нас вельмі многа недахопаў і многа было шкодніцтва. Да нас дырэктарам быў прыслан ворагам народа. Гэты чалавек зрываў стаханаўскі рух і выкананне плана. У рэзультаце ў ліпені мы выканалі план толькі на 93,3 проц. У момант перагляду норм, адпускной кампаніі і падпіскі на пазыку гэты «дырэктар» пабаяўся труднасцей, пайшоў у адпачынак і пакінуў фабрыку.

Шкодніцтва было ў нас і ў адносіне бытавых умоў рабочых. Пабудавалі яслі, і не зрабілі пральні, пачалі будаваць новы фабрычны корпус, за 2 гады вывелі толькі адзін паверх, і на гэтым скончылі.

Ворагі народа — шпіёны былі і на нашай фабрыцы. Быў выкрыт як шпіён начальнік тарыфна-нармаровачнага бюро. Гэты мярзавец доўгі час умела маскіраваўся. А на справе аказалася, што ён шпіён, закляты вораг народа.

Але я павінен сказаць, што мы яшчэ дрэнна прыглядаемся да люзей. Мы не выкрылі ўсіх ворагаў, якія ёсць і на нашай фабрыцы. Словы таварыша Сталіна аб капіталістычным акружэнні патрэбна заўсёды памятаць.

На сённешні дзень у нас ёсць 342 стаханаўцы, якія перавыконваюць нормы. Але ўлік у нас дрэнна пастаўлен. Мы не ведаем — хто колькі перавыконвае. Гэта сведчыць аб пагарджальных адносінах дырэкцыі і грамадскіх арганізацый да важнейшай справы. Не цікавяцца стаханаўцамі трэст і наркамат. Яны зусім не клапоцяцца аб забеспячэнні рабочых фабрыкі патрэбнымі матэрыяламі (замкі, скрэпкі і інш.).

У сувязі з падрыхтоўкай да 20-й галавіны Вялікай Кастрычніцкай рэволюцыі наша фабрыка ўзяла на сябе наступныя абавязацельствы: да кастрычніцкага свята даць дзяржаве прадукцыі звыш плана па 200 тысяч рублёў, даць эканоміі скуры 200 тысяч дэцыметраў, значна павысіць якасць. Свае абавязацельствы мы пачалі выконваць. Мы, стаханаўцы фабрыкі, патрабуем ад гарбарні «Большавік» лепшай якасці скуры з тым, каб мы маглі выпускаць прыгожыя, зграбныя, скурталантарэйныя вырабы.

Хутка пачынаюцца выбары ў Вярхоўны Совет. У нас на фабрыцы арганізаваны гурткі па вывучэнню Палажэння аб выбарах. Ахоплена гэтымі гурткамі 550 чалавек. Па маёй думцы, тут яшчэ ёсць буйныя недахопы. Многія не ведаюць добра Палажэння аб выбарах. З жонкамі рабочых не арганізавана вывучэнне. У нас ёсць работніцы-адзіночкі, якія маюць дзяцей, але э імі асобна палітычная работа не праводзіцца. Партарганізацыя павінна ўлічыць гэта.

У нас на фабрыцы ў сувязі з падрыхтоўкаю да галавіны Кастрычніцкай рэволюцыі разгарнулася соцыялістычнае спаборніцтва паміж цэхамі, групамі і асобнымі рабочымі. Група таў. Перкельвальда выклікала на соцспаборніцтва групу бумажнікаў. Група майстра Флаксмана выклікала на соцспаборніцтва групу майстра Савінай. Майстар Голад выклікаў на соцспаборніцтва майстра Ясіноўскага. Усе гэтыя групы пачалі перавыконваць свае планы. Заключана 390 індывідуальных дагавораў. Мы цяпер на фабрыцы пачалі рыхтавацца да стаханаўскага дэкадніка, і ўпэўнены, што ўсе нашы абавязацельствы, якія ўзялі да Кастрычніка, перавыканаем.

Я сама абавязваюся выканаць норму на 150 проц. і бяру шэфства над адстаючымі рабочымі — Алексіонак і Розінай з тым, каб яны сталі стаханаўцамі.

СІМОН Э. Г.
Стаханаўка ф-кі імя Куйбышэва.

КОНЧЫЛІ ЗДАЧУ ІЛЬНАПРАДУКЦЫІ

Калгасы Шклоўскага раёна імя Кірава, «XII-годзе Кастрычніка», імя Леніна, «Новае жыццё», «Перамога» і імя Свердлова кончылі здачу ільнапрадукцыі дзяржаве па кантрактацыйных дагаварах. Здадзена ільнавалакна высокай якасці ў сярэднім 14,7, 12,8, 13 і 11,5 нумарамі (план 9,5—10,5). Траста таксама добраякасная.

В. КАВАЛЬЧУК.

У СОЦСПАБОРНІЦТВА ЎСТУПАЮЦЬ ЛЯСНІКІ

Рабочыя, інжынерна-тэхнічныя работнікі і служачыя Брыцалавіцкага лесапункта, Асіпавіцкага раёна, уключыўшыся ў соцыялістычнае спаборніцтва на дастойную сустрэчу XX галавіны Кастрычніка, звярнуліся з пісьмом да ўсіх рабочых, інжынерна-тэхнічных работнікаў і служачых лясной прамысловасці Беларусі.

У сваім звароце яны пішуць:

— Нашы кіруючыя апараты яшчэ працуюць па-бюракратычнаму. Вельмі часта машыны, якія знаходзяцца ў лесе, прастойваюць. Вагоны апраўляюцца са складаў нягружанымі. Ёсць зышалкі, калі ворагі калечаць і забіваюць люзей. У лесе гніюць вялікія багацці, а планы, з квартала ў квартал не выконваюцца, заводы працуюць з перабоямі.

Выгнаць усіх шкоднікаў і дывэрсантаў з лясной прамысловасці, увесці ва ўсе галіны работы рацыяналізаваныя інструменты, якіх у нас ёсць у дастатковай колькасці, разгарнуць стаханаўскі рух— вось нашы залачы.

Да XX галавіны Кастрычніка рабочыя, інжынерна-тэхнічныя работнікі і служачыя Брыцалавіцкага лесапункта абавязаліся выканаць цалкам гадавы план і зрабіць увесь лесапункт стаханаўскім. Давесці дзённыя нормы па загатоўках замест плана — 3,72 кбм. да 5,5 кбм., па вывазцы — замест плана 2,21 кбм. да 4,5 кбм.

Л. С.

СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ СПАБОРНІЦТВА БАЙЦОЎ І КАМАНДЗІРАЎ ПАЖАРНАЙ АХОВЫ

Байцы і камандзіры пажарнай аховы НКВД уключаюцца ў перадкастрычніцкае соцыялістычнае спаборніцтва. Нядаўна адбыўся агульнагарадскі сход работнікаў мозырскай пажарнай аховы, на якім абмяркоўвалася пытанне падрыхтоўкі да 20-годдзя Вялікай Кастрычніцкай рэволюцыі. Байцы і камандзіры ўзялі на сябе рад канкрэтных абавязацельстваў аб узмацненні пільнасці, баявой і палітычнай падрыхтоўцы, па барацьбе з пажарамі і т. д. Яны выклікалі на соцыялістычнае спаборніцтва работнікаў рэчыцкай пажарнай аховы.

844 ТОНЫ НА МАЛАТАРНЮ

Ордэнаносец-малацільшчык з Хойніцкай МТС тав. Свірыд Кандрат дастойна сустракае XX гадавіну Кастрычніцкай рэволюцыі. На малатарні «МК-1100» ён намалаціў 716 тон. Да канца сезона тав. Свірыд мяркуе намалаціць не менш 1.500 тон збожжа.

Выпрацоўку малацільшчыка Свірыла перакоўў яго вучань тав. Вінік, які намалаціў ужо 844 тоны на сваю малатарню. Спаборніцтва сярод малацільшчыкаў шырыцца.

М. КУРАПЕЙ.

ДА СВЯТА САБРАЦЬ УЗНОСЫ ПА ПАЗЫЦЫ

Актыўна ўключыўшыся ў перадкастрычніцкае спаборніцтва, многія ўпаўнаважаныя сельскіх советаў па Пазыцы ўмацавання абароны Саюза ССР дабіліся датэрміновага і поўнага збору ўзносаў з калгаснікаў і калгасніц.

Упаўнаважаныя Шэйскага сельсовета, Крупскага раёна, Каралёў Іван (калгас імя Дзержынскага), Ксяндзоў Дзмітрук (калгас «Чырвоны сцяг»), фінактывіст Печарыца Антон і інш. першымі ў рэспубліцы сабралі поўнасцю грошы на суму ў 13 тысяч рублёў.

Упаўнаважаныя Герасімовіч Сямён (калгас імя Дзержынскага, Менскага раёна) сабраў 4.295 руб., Падабед Іван (калгас «Прамень соцыялізма»)—2.440 руб., Лаптух Іван (калгас «Чырвоная воля», Гомельскага раёна) — 2.240 руб., Самусёў Рыгор, Кавалёў Сяргей, Емельянаў Кірыл (калгас «Камінтэрн», Магілёўскага раёна) — 9.440 руб. і інш.

Наркамфін БССР і Кіраўніцтва ашчадкасамі і дзяржкрэдыта за вялікую актыўнасць па збору ўзносаў і падпісцы на пазыку прэміравала грашыма 54 лепшых упаўнаважаных сельскіх советаў на суму 5000 руб. Усяго прэміравалі актывістаў па 29 раёнах.

Усе ўпаўнаважаныя сельсоветаў па пазыцы, селькамсолы і фінансавы актыў павінны паследаваць прыкладу гэтых таварышоў. Шырокай арганізацыйна-масавай работай і разгортваннем перадкастрычніцкага спаборніцтва яны павінны дабіцца да XX гадавіны Кастрычніка поўнага датэрміновага збору ўзносаў па пазыцы сярод калгаснікаў і працоўных адпаасобнікаў.

ПЕРЭЛЬМАН.

ПАСТАНОВА ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА СССР

Дзеючым крымінальным законадаўствам СССР і саюзных рэспублік для барацьбы з шпіянажам, шкодніцтвам, са спробамі арганізацыі ўзрываў, крушэнняў, нападаў з чалавечымі афярамі і інш. дыверсійных актаў устаноўлены ў якасці мер крымінальнага пакарання — пазбаўленне волі на тэрмін не звыш 10 год, а для найбольш цяжкіх відаў дзяржаўных злачынстваў — вышэйшая мера пакарання (расстрэл).

У мэтах далейшай барацьбы з такога роду злачынствамі і прадастаўлення суду магчымасці выбіраць па гэтых злачынствах не толькі вышэйшую меру пакарання (расстрэл), але і пазбаўленне волі на больш працяглыя тэрміны, Цэнтральны Выканаўчы Камітэт СССР **пастанаўляе:**

1. У змену арт. 18 «Асноўных пачаткаў крымінальнага законадаўства СССР і саюзных рэспублік» устанавіць у якасці меры крымінальнага пакарання пазбаўленне волі на тэрмін не звыш 25 год.

2. Прапанаваць Цэнтральным Выканаўчым Камітэтам саюзных рэспублік прывесці сваё законадаўства ў адпаведнасць з гэтай пастановай.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта СССР
М. КАЛІНІН.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта СССР
А. ГОРКІН.

Масква, Крэмль,
2 кастрычніка 1937 г.

РЫХТУЮЦЦА ДА ВЫБАРАЎ У ВЯРХОЎНЫ СОВЕТ

Партыйныя арганізацыі Менска за апошні час узмацнілі падрыхтоўку да выбараў у Вярхоўны Совет СССР.

На 81 выбарчы ўчастак разбіт горад. З іх 35 выбарчых участкаў прымацаваны да Кагановіцкага, 29 да Варашылаўскага і 17 да Сталінскага райкомаў КП(б)Б. Падабраны адказныя таварышы для разгортвання палітычна-масавай работы на выбарчых участках. Апрача гэтага, да кожнага выбарчага ўчастка прымацаваны па 2—3 партыйныя арганізацыі. Прымацаванне праведзена па па тэрытарыяльнаму прынцыпу. Амаль усюды падабраны памяшканні—цэнтры выбарчых участкаў.

Зараз ва ўсіх партарганізацыях горада праходзіць падбор агітатараў для растлумачэння Палажэння выбаршчыкам вызначанага ўчастка.

Да 24 выбарчага ўчастка (раён Серабранкі і Чырвонаармейскай) прымацаваны калектыв фабрыкі «Комунарка» і ТЭЦ.

На фабрыцы «Комунарка» праведзены па гэтаму пытанню гутаркі па цэхах. Вылучана 30 падрыхтаваных і аўтарытэтных на фабрыцы агітатараў. Сярод іх: дэпутат горсовета т. Радкевіч, брыгадзір-электратэхнік т. Лісоўскі, зменны майстар Мязвезева, інжынер Палеес і інш. Для агітатараў арганізаван семінар. Яны прыступаюць да азнаямлення з жыхарамі дамоў, дзе яны будуць кіраваць гурткамі (прыкладна адзін чалавек на 10 дамоў). Вылучана таксама 8 чалавек для арганізацыйнай работы.

На тэрыторыі фабрыкі будзе пэнт гэтага выбарчага ўчастка. Памяшканне выбарчага ўчастка будзе прыгожа афарбавана, заслана дыванамі, радыёфікавана

АГІТМАСАВУЮ РАБОТУ ЯШЧЭ НЕ АРГАНІЗАВАЛІ

Аршанскі РВК і прэзідыум горсовета зацвердзілі па гораду Оршы 16 выбарчых участкаў.

Участак з найбольшай колькасцю насельніцтва налічвае 1.890 чалавек і з найменшай — 1.570. Самастойным выбарчым участкам з'яўляецца будаўніцтва ільнакамбіната, які налічвае 1.500 чалавек. Падабраны найлепшыя памяшканні для выбарчых участкаў: гортэатр, аэраклуб, клуб ПВХО, педтэхнікум, клубы прадпрыемстваў: мясакамбіната, мехзавода, арцелі «Дняпро», а таксама лепшыя памяшканні сярэдніх школ.

Дасканала вызначаны вуліцы, якія ўваходзяць у кожны выбарчы ўчастак.

У мэтах стварэння найбольшых выгад для выбаршчыкаў улічвалася адлегласць да памяшкання, дзе будуць адбывацца выбары.

У бліжэйшыя дні горсовет заканчвае складанне папярэдніх спісаў выбаршчыкаў.

Для аператыўнага кіраўніцтва работай па выбарах у Вярхоўны Совет як у часе падрыхтоўкі, так і ў часе правядзення выбараў прэзідыум горсовета прымацаваў членаў прэзідыума і актыў горсовета да кварткомаў (іх у горадзе 12) і прадпрыемстваў. Задачы гэтых таварышоў—весці штодзённую работу па падрыхтоўцы выбаршчыкаў свайго ўчастка да выбараў, па арганізацыі вывучэння выбарчага закона, асабліва сярод неарганізаванага насельніцтва. Пры кварткомах створаны гурткі па ліквідацыі непісьменнасці.

Сур'ёзным недахопам у рабоце горсовета з'яўляецца тое, што дагэтуль не наладжана як след работа гурткоў па вывучэнню выбарчага закона, асабліва ў жактах, сярод хатніх гаспадынь і іншых груп насельніцтва; не наладжана яшчэ праверка работы кожнага агітатара і бяседчыка.

Шчыльна за агітацыйна-масавую работу ў шырокіх колах неарганізаванага насельніцтва мы яшчэ не ўзяліся. Між тым, ёсць паасобныя сігналы аб варожай дзейнасці класава-варожых элементаў. Так, у горадзе, за Дняпром пад ноччу абыходзіць дамы і дапытваецца ў жыхароў, за каго яны будуць галасаваць у Вярхоўны Совет.

І яшчэ адзін сур'ёзны недахоп — гэта слабая работа секцый горсовета і дэпутацкіх груп. Зусім відавочна, што ўзнятае работы такіх секцый, як комунальная, бытавая і іншая, з'яўляецца вельмі важным момантам у падрыхтоўцы да выбараў.

7 кастрычніка арганізуецца гутарка з маладымі выбаршчыкамі, якім споўняецца 18 год і якія ўпершыню будуць прымаць удзел у выбарах.

Н. К. ШЧЭРБА,
старшыня Аршанскага горсовета.

213 ГУРТКОЎ ПА ВЫВУЧЭННЮ ВЫБАРЧАГА ЗАКОНА

МАГІЛЕЎ. Для лепшага ўсваення выбарчага закона Магілёўскі гарком партыі сумесна з горсоветам арганізуе гурткі, у якіх будзе вывучацца «Палажэнне аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР». Для рабочых і служачых горада арганізуецца 213 гурткоў. Апрача таго, 59 гурткоў арганізуецца пры школах. У гэтых гуртках выбаршчыкі будуць вывучаць мацеры вучняў. Столькі-ж гурткоў арганізуецца пры жактах. У іх будуць вызучаць выбарчы закон усе хатнія гаспадыні і ўсё астатняе насельніцтва.

Для кіраўніцтва гурткамі прыцягваюцца лепшыя агітатары заводаў і ўстаноў. Для таго, каб кіраўнікі гурткоў добра самі вывучылі выбарчы закон, з імі будуць праводзіцца семінары. Першы семінар адбыўся 1 кастрычніка. Усе гурткі будуць працаваць па спецыяльна распрацаванай праграме.

ФРАЛОЎ.

Р. ВОЛЬСКІ

Да выбараў у Вярхоўны Совет СССР

ПАРАДАК ГАЛАСАВАННЯ

Падача галасоў і вызначэнне вынікаў выбараў ёсць апошні этап выбараў. Калі кандыдаты выстаўлены і зарэгістраваны, спісак кандыдатаў па кожнай выбарчай акрузе ў Совет Саюза і ў Совет Нацыянальнасцей апублікован, — наступае момант, калі грамадзяне прыступаюць да падачы галасоў.

У перыяд паміж выстаўленнем кандыдатаў і днём галасавання ідзе ажыўленая агітацыя за таго ці іншага кандыдата, агітацыя па растлумачэнню велізарнага значэння выбараў у Вярхоўны Совет СССР для ўсяго нашага народа, для ўсіх працоўных свету; агітацыя, якая мабілізуе ўсіх выбаршчыкаў СССР выканаць свой абавязак совецкага грамадзяніна і з'явіцца ў дзень выбараў у памяшканне свайго выбарчага ўчастка для падачы голасу за самага вартага з кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР.

Дзень выбараў — адзіны для ўсяго Саюза Совецкіх Сацыялістычных Рэспублік, устанаўліваецца Прэзідыумам Вярхоўнага Совета СССР, а да выбрання такога — Прэзідыумам ЦВК СССР. Выбары назначаюцца ў нерабочы дзень. Магчыма, што такім днём будзе агульнавыхадны дзень, які прыпадае на нядзелю. Тэрмін выбараў устанаўліваецца не пазней чым за 2 месяцы да дня выбараў.

Падача галасоў за кандыдатаў у дэпутаты абодвух палат Вярхоўнага Совета СССР, г. зн. у Совет Саюза і ў Совет Нацыянальнасцей, праходзіць у адзін і той-жа дзень, у адзін і той-жа час, у адным і тым-жа памяшканні. Прыём выбарчых бюлетэняў ад выбаршчыкаў будзе праводзіцца на працягу 18 гадзін — з 6 гадзін раніцы да 12 гадзін ночы дня выбараў. У буржуазных краінах тэрмін падачы галасоў звычайна не перавышае 12 гадзін. Наш выбарчы закон устанавіў больш працяглы тэрмін, для таго, каб кожнаму выбаршчыку прадаставіць магчымасць выбраць самы зручны для сябе час для падачы голасу.

У памяшканні для выбараў з моманту пачатку галасавання ідзе толькі падача выбарчых бюлетэняў. Выбарчая агітацыя ў памяшканні для выбараў не дапускаецца.

У памяшканні для галасавання абавязкова захаванне поўнага парадку і дысцыпліны. Кожны выбаршчык мае доступ у гэтае памяшканне свайго ўчастка, бо выбары праводзяцца публічна, — усякі выбаршчык можа ўласнымі вачыма пераканацца, што выбары праходзяць у поўнай адпаведнасці з патрабаваннямі Сталінскай Канстытуцыі і «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР». Старшыня Ўчастковай выбарчай камісіі нясе адказнасць за парадак у выбарчым памяшканні, яго распаряджэнні для ўсіх прысутных абавязковы.

У дзень выбараў старшыня Ўчасткозай выбарчай камісіі і ўсе яе члены абавязаны з'явіцца ў памяшканне для выбараў загадзя і ў 6 гадзін раніцы адкрыць пасяджэнне камісіі. Перш за ўсё, старшыня Ўчастковай выбарчай камісіі ўпэўніваецца на вачах у членаў камісіі, што выбарчыя скрынкі пэлыя і ў поўнай прыгоднасці, што ў іх нічога няма. Затым скрынкі зачыняюцца і апячатваюцца пячаткай камісіі, пасля чаго старшыня Ўчастковай выбарчай камісіі запрашае выбаршчыкаў прыступіць да падачы галасоў.

Падача галасоў і работа Ўчасткозай выбарчай камісіі павінны прадаўжацца бесперапынна да сканчэння падліку галасоў, паданых у даным участку. На працягу ўсяго гэтага часу абавязкова пастаянная прысутнасць больш паловы агульнага ліку членаў Ўчастковай выбарчай камісіі.

Выбаршчык павінен ажыццявіць сваё права асабіста. Для падачы голасу ён павінен асабіста з'явіцца ў памяшканне для галасавання і асабіста апусціць свой выбарчы бюлетэнь у выбарчую скрынку.

«Палажэнне аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР» вызначае ўпаўнаважванне памяшкання для выбараў. Яно складаецца па крайняй меры з 2-х пакояў: з пакоя, у якім засядае Ўчастковая выбарчая камісія і з пакоя для запаўнення бюлетэняў. Калі ў пакой для запаўнення бюлетэняў будзе дапускацца адначасова некалькі выбаршчыкаў, у ім пазіцыі былі загадзя зроблены перагародкі ці пастаўлены шырмы адпаведна ліку асоб, адначасова дапускаемых для запаўнення бюлетэняў. Такое мерапрыемства неабходна для таго, каб абараніць тайну галасавання. Таму зрабіць перагародкі ці шырмы трэба так, каб ніхто не мог бачыць, як выбаршчык запаўняе свае бюлетэні.

У пакой для запаўнення бюлетэняў ці ў агароджаную (перагародкай ці шырмай) частку пакоя можа быць дапушчан адначасова толькі адзін выбаршчык, бо ніхто не мае права прысутнічаць пры запаўненні бюлетэняў (у тым ліку і члены Ўчастковай выбарчай камісіі). Выключэнне з гэтага правіла дапускаецца толькі для выбаршчыкаў, якія з прычыны непісьменнасці ці якога-небудзь фізічнага недахопу не маюць магчымасці самі запоўніць бюлетэні, — ім прадастаўлена праза запрашаць у пакой, дзе запаўняюцца выбарчыя бюлетэні, любога другога выбаршчыка для дапамогі ў запаўненні выбарчых бюлетэняў.

Выбарчы закон не ставіць асобых умоў для афармлення выбарчага памяшкання. Аднак, зусім ясна, што памяшканне, у якім праходзіць важнейшы і сур'ёзнейшы дзяржаўны акт, якім з'яўляюцца выбары ў дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР, павінна быць зручным, культурна абсталёваным і т. д.

Як-жа праходзіць сам працэс падачы галасоў?

I. З'явіўшыся ў выбарчае памяшканне, выбаршчык падыходзіць да сакратара Ўчастковай выбарчай камісіі і прад'яўляе яму пашпарт або калгасную кніжку, або прафсаюзны білет, або іншае пасведчанне асобы. Выбаршчыкі, прыбыўшыя з іншага выбарчага ўчастка з «пасведчаннем на права галасавання», прад'яўляюць адно з вышэй пералічаных пасведчанняў асобы, а таксама «пасведчанне на права галасавання».

II. Сакратар Ўчастковай выбарчай камісіі правярае прад'яўленае яму выбаршчыкам пасведчанне асобы.

адзначае ў спіску выбаршчыкаў яўку выбаршчыка супроць яго прозвішча і

выдае яму выбарчыя бюлетэні і канверт устаноўленага ўзору.

Выбаршчык, з'явіўшыся ў выбарчае памяшканне з «пасведчаннем на права галасавання», заносіцца сакратаром у асобны спісак выбаршчыкаў (які далучаецца да асноўнага спіска выбаршчыкаў), пасля чаго яму выдаюцца бюлетэні і канверт.

III. Выбаршчык, атрымаўшы бюлетэні і канверт,

ідзе ў пакой для запаўнення бюлетэняў,

заходзіць за сваёдную перагародку ці шырму, дзе без сведкаў, нікім не назіраемы і не кантралюемы,

выкрэслівае ў атрыманых ім бюлетэнях прозвішчы кандыдатаў, за якіх ён не галасуе, пакідаючы незакрэсленым прозвішча толькі таго кандыдата ў дэпутаты, за якога ён хоча падаць свой голас, затым

укладвае бюлетэні ў канверт,

заклейвае яго,

пераходзіць назад, у пакой, у якім засядае Ўчастковая выбарчая камісія, і

асабіста апускае канверт з выбарчымі бюлетэнямі ў выбарчую скрынку.

У часе падачы і падліку галасоў сакратар Ўчастковай выбарчай камісіі вядзе пратакол пасяджэння Ўчастковай выбарчай камісіі. У яго заносяцца ўсе выпадкі, калі выбаршчык не быў дапушчан да галасавання, і ўказваецца прычына гэтага. У пратакол заносяцца заявы і скаргі выбаршчыкаў на дзеянні Ўчастковай выбарчай камісіі і рашэнні, прынятыя па гэтых заявах і скаргах.

Роўна ў 12 гадзін ночы закрываецца доступ у выбарчыя памяшканні, і пасля таго, як паданы былі галасы выбаршчыкаў, якія асталіся пры закрытым выбарчага памяшкання. Ўчастковая выбарчая камісія прыступае да падліку галасоў.

Для галасавання кожны выбаршчык атрымлівае выбарчыя бюлетэні і канверт устаноўленага ўзору і колеру. Сапраўдныя пры падліку галасоў прызнаюцца толькі выбарчыя бюлетэні, якія адпавядаюць патрабаванням закона і паданы ў канвертах устаноўленага ўзору.

Для таго ўстаноўлены такія правілы адносна выбарчых бюлетэняў і канвертаў? Ці не прасцей было-б прадаставіць кожнаму выбаршчыку пісаць прозвішча кандыдата на якой заўгодна паперы, укладваць бюлетэні ў любы канверт і т. д.

Галоўная падстава, чаму нельга так рабіць, ёсць неабходнасць ахоўваць замацаванае ў Канстытуцыі СССР тайнае галасаванне. Таму «Палажэнне аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР» прадпісала, каб Цэнтральная выбарчая камісія ўстанавіла форму і колер выбарчых бюлетэняў і канвертаў для іх. Выбарчыя бюлетэні па кожнай выбарчай акрузе павінны быць такія, каб па знадворнаму выгляду, г. зн. па тэксту, па размеру, колеру і якасці паперы, — яны нічым адзін ад аднаго не адрозніваліся. Дасягнуць поўнай аднолькавасці выбарчых бюлетэняў зручней за ўсё такім шляхам, каб яны загатаўліваліся адным і тым-жа органам.

«Палажэнне аб выбарах» устанавіла, што Ўчастковыя выбарчыя камісіі забяспечваюцца выбарчымі бюлетэнямі адпаведнай Акруговай па выбарах у Совет Саюза выбарчай камісіяй і Акруговай па выбарах у Совет Нацыянальнасцей выбарчай камісіяй. Далей, тайну галасавання лёгка раскрыць і ў тым выпадку, калі выбаршчыкі будуць карыстацца неаднолькавымі канвертамі. Таму «Палажэнне аб выбарах» цалкам правільна ўстанавіла, што і канверты павінны адпавядаць устаноўленаму Цэнтральнай выбарчай камісіяй узору.

Выбаршчыкі павінны помніць, што ў выбарчым бюлетэні трэба пакінуць незакрэсленым толькі прозвішча таго кандыдата ў дэпутаты, за якога яны галасуюць. Калі-ж у бюлетэнях пакінуць незакрэсленымі два ці больш прозвішч, то робіцца незразумелым, за якога з кандыдатаў выбаршчык галасуе. Такія выбарчыя бюлетэні з'яўляюцца несапраўднымі, яны не будуць прымацца пад увагу пры падліку галасоў.

«Палажэнне аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР» самым пільным і падрабязнейшым чынам рэгламентуе парадак галасавання. У такой важнай справе, як выбары вярхоўнага органа ўлады, ні адно дадатковае патрабаванне закона, ні адна дэталь не з'яўляецца лішняй, калі яна садзейнічае большай гарантыі ўсеагульнага, прамога, роўнага і тайнага галасавання.

Што ўсякае пытанне тэхнікі выбараў набывае выключнае палітычнае значэнне, вельмі добра відаць з вопыту выбараў у буржуазных краінах. Няма чаго і гаварыць пра «выбары» ў фашысцкіх краінах, дзе «галасаванне» суправаджаецца такім разгулам тэрору ў адносінах да ўсіх інакшмыслячых і незадаволеных фашысцкім рэжымам, што «выбары» ў гэтых краінах з'яўляюцца гнусным і зверскім апуканствам і здзекам з народных мас. Але і ў буржуазных дэмакратычных краінах тэхніка выбараў і галасавання такая, што астаюцца шматлікія лазейкі для скажэння волевыяўлення выбаршчыкаў, для парушэння тайны галасавання, для націску на выбаршчыкаў, для подкупу, шантажа і пагроз па адрасу выбаршчыкаў.

Наш выбарчы закон стаіць на варце праў выбаршчыка. Ясна і дакладна ўстанаўлівае ён парадак галасавання, гарантуючы кожнаму выбаршчыку яго правы, прадастаўленыя яму Сталінскай Канстытуцыяй—хартыяй сацыялістычнага дэмакратызма.

СПРАВЫ КІРАЎНІКОЎ НАРАЎЛЯНСКАГА РАЁНА

Ужо два гады старшынёй Нараўлянскага раёна працуе таз. Аксючэнка. Пры яго «кіраўніцтве» раён увесь час цягнецца ў хвосце па выкананню палітычна-гаспадарчых кампаній.

У радзе сельсавецтаў доўгі час парушалася рэвалюцыйная законнасць, груба скажалася палатковая палітыка. Толькі за 1937 год паступіла ў ЦВК БССР і раённыя арганізацыі 1549 скарг ад працоўных Нараўлянскага раёна.

Усе заявы сігналізавалі аб перагібах, незаконным із'яцці маёмасці (Лузан Пелагея, Макаранка, Захільскі, Кавальчук і многа іншых).

Прэзідыум райвыканкома на чале з Аксючэнка штампаваў пастановы аб незаконных із'яцціях. Нават пасля рашэння партыі і ўрада аб лепельскіх спразах у Нараўлі ўпарта марудзілі з выпраўленнем перагібаў і са эзаротам незаконна із'ятай маёмасці.

Старшыня Вербавіцкага сельсовета Карпман зрабіў каля 50 незаконных із'яцяў маёмасці. Замест таго, каб яго прыцягнуць да адказнасці, РВК вылучае Карпмана загадчыкам канторы Заготжывёлы. Такім-жа чынам старшыня Галоўчыцкага сельсовета Касценка вылучан загадчыкам канторы Плодагародніны.

У сельсоветы-ж пасылаюцца людзі, не ўмеючыя палітычнага давер'я. Старшынёй Углаўскага сельсовета райвыканком прызначыў выключанага з партыі чалавека з цёмным мінулым, які ў сельсавеце займаўся ўвесь час шкодніцтвам. Зараз ён зыкрыт органамі НКВД.

Былы старшыня местсовета Бушэлеў п'янстваваў разам з Аксючэнкам, займаўся вымагательствам і растратай. Старшыня РВК перакідвае Бушэлева на работу ў дакасці старшыні Дзямідаўскага сельсовета, дзе ён паспеў ужо растраціць тысячу рублёў.

Большая частка заяў, якія паступалі ў райвыканком, не разглядаліся па двачатыры месяцы. Уліку заяў наогул няма.

Многія адказы райвыканкома ўзначальваюць людзі, якія мелі да гэтага рад палітычных памылак і спагнанняў. Загадчык райфа Булава мела рад партыйных спагнанняў за незаконныя дзеянні ў Карпатковіцкім раёне. У Нараўлянскім раёне яна прадаўжае санкцыянаваць незаконныя дзеянні сельсветаў па спагнанню плацяжоў і із'яцці маёмасці.

Райупаўкамзаг Марголін на працягу 1936 года праводзіў у раёне незаконнае спагнанне натуральных плацяжоў, накладваў незаконныя штрафы па 500—600 рублёў і адбіраў маёмасць і хатнія рэчы.

Райсабезам кіруе Шпакоўскі. Працуючы загадчыкам райгандлю, ён правяліў работу. За жульніцкія махінацыі ў адзеле сувязі быў судзім. Але Аксючэнка чамусьці высунуў яго на кіруючую работу ў апарат райвыканкома.

У пачатку 1937 года быў вылучан загадчыкам райза тав. Юшчэнка, які таксама меў рад партыйных спагнанняў у час работы ў сельсавеце. Зараз ён праваліў работу ў райза.

Да гэтага часу не рэарганізаваны школьніцка арганізаваныя фермы. Яшчэ не ва ўсіх сельскагаспадарчых арцелях калгаснікі ведаюць свае прысядзібныя ўчасткі. Юшчанка і Аксючэнка марудна праводзяць у жыццё пастанову СНК СССР і ЦК ВКП(б) аб ільготах беларускаму сялянству.

30 тон гатункованага насення ў калгасах «Новыя Міцькі» і «Чырвоны Ташкаў», а таксама на складах Заготзярно заражаны кляшчом другой ступені. Амальшто ўсе млыны раёна прывезены ў нягоднасць. У раёне меў месца масавы падсёж пятавай сілы. План асенняй сяўбы да 1 кнаасобнікаў не давезен.

Усе гэтыя факты сведчаць аб тым, што кіраўніцтва Нараўлянскага раёна не прымае ніякіх мер да ліквідацыі вынікаў шкодніцтва, якое працягваецца і зараз.

Пры праверцы ўстаноўлена, што рад пастаноў прэзідыума райвыканкома не падпісаны ні старшынёй, ні сакратаром. Рад пастаноў праводзіўся апросам і падпісаны толькі адным Аксючэнкам. На пасяджэнні прэзідыума з 9 членаў прысутнічала не больш 3—4 чалавек.

Арганізацыйна-масавая работа райвыканкома вусім слабая. З арганізаваных 176 секцый пры сельскіх советах амаль ні адна не працуе. Прэзідыум райвыканкома на сваіх пасяджэннях ні разу не заслухоўваў справаздачу сельсовета аб рабоце секцый і дэпутацкіх груп. Наказы выбаршчыкаў не выконваюцца.

Райвыканком не займаецца культурным будаўніцтвам у раёне. Адпушчаныя сродкі на ўпарадкаванне мястэчка і сельсветаў выдаткоўваюцца без усякага кантролю і каштарысаў.

Многія школы раёна пачалі навучальны год непадрыхтаванымі. Даўлядоўская, Вербавіцкая, Мохаедаўская няпоўныя сярэднія школы не закончылі дагэтуль рамонту. Амаль-што ні адна школа не забяспечана палівам. Зараз у радзе школ (Гажынская, Мохаедаўская) наведванне вучняў складае ўсяго 50—60 проц.

Па ўсёй краіне пачалася падрыхтоўка да выбараў у Вярхоўны Совет. Прапоўныя вывучаюць «Палажэнне аб зыбарах» і Сталінскую Канстытуцыю. У Нараўлянскім-жа раёне ніхто гэтай справай не займаецца.

ЛОГІНАЎ.

ЗРЫВАЮЦЬ ЗЯБЛІВАЕ ВОРЫВА

Совецкія і партыйныя арганізацыі Менскага раёна не арганізавалі барацьбу за своечасовае і высокаякаснае выкананне плана зяблевага ворыва. На 25 верасня па раёну ўзнята ўсяго 10.645 гектараў зяблева пры плане 35,201 гектар, што складае 30 проц.

У калгасах Папярнянскага сельсовета за апошнюю дзесяцідзённку ўзнята ўсяго 20 гектараў зяблева, у калгасах Грычанскага сельсовета — 31,5 гектара.

Не лепш і па калгасах Негарэльскага сельсовета. З патрэбных па плану 1415 гектараў зяблева ўзнята 269 гектараў. У калгасах «КІМ» і «Большэвік» яшчэ і зараз не распачалі зяблевага ворыва. У калгасах «Зара Захада» ўзнята 7 гектараў з патрэбных 70 гектараў.

З рук вон дрэнна МТС выконваюць заключаныя дагаворы па ўзлыму зяблева па калгасах раёна. Трактары больш прастойваюць, чым працуюць.

Такое становішча пагражае зрывам ворыва зяблева па раёну. Але-ж ні райком КП(б)Б, ні райвыканком, ні райза не прымаюць мер да разгортвання зяблевага ворыва ў раёне.

МЕНСКІ.

У МЕНСКІМ ВАЕННЫМ ВУЧЫЛІШЧЫ

1 кастрычніка пачаліся рэгулярныя заняткі на першым курсе Менскага ваеннага вучылішча імя М. І. Калініна. Сотні маладых рабочых і калгаснікаў, адзетыя ў новую ваенную форму, запоўнілі шматлікія аўдыторыі.

Сярод маладых курсантаў няма ніводнага з асветаю ніжэй 8 класаў, многія з іх маюць сярэднюю асвету. Больш паловы курсантаў—комсамольцы. Малады совецкія патрыёты прышлі ў ваеннае вучылішча, маючы і ваенную падрыхтоўку, многія з іх маюць па 2—3 абаронныя значкі.

Выходны дзень у калгасе «Інтэрнацыянал», Асіпавіцкага раёна. НА ЗДЫМКУ: Калгасніцы танцуюць у калгасным парку культуры і адпачынку.

Фото Я. Салавейчыка.

СВЯТА НА ФАБРЫЦЫ

Ужо цяпер рабочыя, служачыя і інжынерна-тэхнічныя работнікі менскай швейнай фабрыкі «Кастрычнік» рыхтуюцца, каб радасна і весела правесці вялікае свята прапоўных — 20-годдзе Кастрычніцкай рэвалюцыі. Гурткі мастацкай самадзейнасці ўзмоцнена рэпетыруюць святочны рэпертуар. Драмгурток пакажа рабочым музыкальную інсцэніроўку па тэме «12 песень аб Чырвонай Арміі». Джаз і танцавальны гурток рыхтуюць праграмы сваіх выступленняў з беларускіх народных і совецкіх песень і народных танцаў.

Калектыў фабрыкі выйдзе на Кастрычніцкую дэманстрацыю калонай, арыгінальна і змястоўна ўпрыгожанай, яркай і маляўнічай. 200 чалавек апранушца ў касцюмы нацыянальнасцей Саюза і ў часе дэманстрацыі будуць выконваць народныя танцы. У калоне пойдуць запейнікі, акрабаты, музыканты, спевакі, дэкламатары і інш.

Намячаецца правесці вечар сустрэчы равеснікаў Кастрычніка са старымі рабочымі і асобна вечар моладзі, якая ўпершыню атрымлівае выбарчае права і якая будзе ўпершыню выбіраць у Вярхоўны Совет СССР на аснове новай Сталінскай Канстытуцыі.

Вялікая ўвага аддаецца падрыхтоўцы да свята і ў быту. Фабрычныя арганізацыі размеркавалі ўжо сярод рабочых звыш 20 тысяч рублёў на рамонт і абсталяванне кватэр. Да свята будуць адрамантаваны 95 кватэр. Апрача таго вызелена значная сума для аказання дапамогі шматсямейным.

РАДАСЦЬ БАЦЬКІ

Мне 52 года, але я нікольскі не турбуюся за сваё будучае. Сталінская Канстытуцыя дае нам, старым, магчымасць жыць, не ведаючы нястачы. Старыя ў нашай краіне ў пашане. Нашы дзеці растуць, абружаныя клопатамі партыі і ўрада.

У мяне 7 дзяцей. Усе яны дзякуючы совецкай уладзе выйшлі ў людзі, сталі на шырокую дарогу жыцця. Самы старшы, 24-гадовы Юрый ўжо другі год служыць у Чырвонай Арміі ў казачай часці. Дзімітрый—таксама другі год служыць у Асобай Чырвонасцяжнай Далёкаўсходняй Арміі. Я рад, што мае сыны ахоўваюць мірную працу ў Совецкай краіне. Трэці сын, 18-гадовы Грыгорый вучыцца ў аўтадарожным тэхнікуме. 16-гадовы Міша скончыў сямігодку і ў гэтым годзе паступіў у хіміка-тэхналагічны тэхнікум харчовай прамысловасці. Ігнату 10 год і ён вучыцца ў 3 класе. Дома асталіся самыя маленькія мае дачуркі—адной 6 год, другой 3. І іх чакае выдатнае будучае.

У гэтым годзе, згодна пастановы ўрада, наша сям'я атрымала дапамогу па шматсямейнасці. І мне, старому, вельмі радасна, што краіна клапоціцца аб кожным чалавеку, што маіх дзяцей чакае радаснае і шчаслівае жыццё грамадзян вялікай совецкай краіны.

Дзякуй таварышу Сталіну за вясёлае, шчаслівае і культурнае жыццё.

БУКАЦІЧ ВАСІЛІЙ КАСПЕРОВІЧ,
Калгаснік сельгасарцелі «Пробуждение», Смалявіцкага раёна.

ПАДРЫХТОЎКА І ПЕРАПАДРЫХТОЎКА ПРАПАГАНДЫСЦКІХ КАДРАЎ

На тэрыторыі Ленпартгарадка ў Менску разгорнута сетка курсаў па падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы прапагандыстаў, арганізаваных аддзелам партыйнай прапаганды і агітацыі ЦК КП(б)Б.

З 20 жніўня тут працуюць трохмесячныя курсы па перападрыхтоўцы кіраўнікоў партыйных школ і гурткоў. На курсах займаецца 140 чалавек з усіх раёнаў БССР. З іх 15 інструктароў РК КП(б)Б, 10 загалчыкаў партыйных кабінетаў, 60 чалавек—работнікі раённага актыва, астатнія працуюць парторгамі і старшынямі калгасаў. У праграме курсаў: гісторыя СССР, гісторыя ВКП(б), гісторыя грамадзянскай вайны, геаграфія. Канстытуцыя. Прапагандысты праслухаюць рад лекцый па літаратуры і міжнароднаму становішчу.

Прыступіла да нармальных заняткаў рэспубліканская школа прапагандыстаў. Тэрмін навучання ў школе ўстаноўлен у 1 год і 3 месяцы. Кантынгент курсаў зацверджан ЦК КП(б)Б у 100 чалавек, але набрана пакуль-што толькі 65 чалавек. Трэба адзначыць, што асобныя партарганізацыі (Барысаў, Магілеў, Слуцк) несур'ёзна аднесліся да вылучэння кандыдатур, не выканалі раззёрстку ЦК КП(б)Б або прыслалі кандыдатаў, неадпавядаючых правілам прыёму.

КАЛГАСНАЯ АРХІТЭКТУРА

За гады совецкай улады непазнавальнымі сталі калгасныя сёлы Беларусі. У які-б раён ні заехаў: усюды бачыш квітнеючае калгаснае жыццё. Новымі жылымі дамамі, новымі школамі, больніцамі, фруктовымі садамі, зелізарнымі надворнымі пабудовамі ўзбагаціўся воблік калгасных вёсак.

Кашмарным і даўнешнім здаецца яшчэ не так далёкае мінулае беларускага народа. Вось як выглядала, напрыклад, дарэвалюцыйная беларуская вёска паводле матэрыялаў абследвання населеных месц, што адносяцца зараз да Асіпавіцкага раёна:

«Усе хаты цягнуцца ўдоўж адной вуліцы — пасялковай дароги. Агульны выгляд вёскі шэры. Вуліцы ва ўсіх вёсках восенню настолькі брудныя, што па іх трэба ездзіць вярхом. Восенню часта зусім спыняюцца зносіны аднаго канца вёскі з другім. Тыпы хат — чатырохсценныя, з сенцамі. У хаце — адзін пакой з печкай направа ці налева, пры самым уваходзе. Падлога сустракаецца рэдка».

Не толькі ў Асіпавіцкім раёне, але нават у самых глухіх раней раёнах вы зараз бачыце калгасную вёску, непараўнана больш упарадкаваную і маляўнічую, чым тая дарэвалюцыйная вёска, непрыглядны вобраз якой ярка аллюстраван у матэрыялах абследвання.

У такім, раней глухім і трушчобным кутку Палесся, як у пагранічным Тураўскім раёне, мы бачым яркія поспехі калгаснай архітэктуры. Возьмем, напрыклад, вёску Хільчыцы. Пад'язджаючы ўжо да яе вы любуецеся новымі дваравымі пабудовамі мясцозага калгаса. У самой вёсцы пабудаваны новыя калгасныя прасторныя хаты з некалькімі пакоямі. У цэнтры вёскі красуецца вялікая новая школа. Прыгожа пабудавана электрастанцыя і разбіт па-суседству з ёю новы вялікі фруктовы сад.

У калгасе імя Тэльмана, у Брагінскім раёне, пабудаваны новыя дамы з 2—3 пакояў. Калгасныя кватэры атынкованы і пабелены. У калгасе «Чырвоная ніва», Аршанскага раёна, пабудавана электрастанцыя і ваданапорная вежа. Калгаснікі збіраюцца правесці ваданправод у кожную хату. У калгасе «Чырвоны спецыяліст», Менскага раёна, пабудавана 10 новых жылых дамоў. Новыя гумны на каменных фундаментах. Пабудаваны скотныя дзары, а таксама гараж для калгаснага аўтамабіля. Такіх калгасаў можна назваць многа.

У гэтым годзе калгасы Беларусі, як і ўсёй нашай вялікай краіны, знялі з палёў багаты ўраджай. Вялікія прыбыткі, атрымліваемыя калгаснікамі, і ліквідацыя вынікаў шкодніцкай работы фашысцкіх шпіёнаў і дыверсантаў, што арудавалі ў сельскай гаспадарцы Беларусі, дадуць калгаснаму будаўніцтву яшчэ больш размах. Узраснае калгаснае жыллёвае будаўніцтва і будаўніцтва калгасных культурных устаноў.

Устае пытанне: ці падрыхтован да такога размаху калгаснага будаўніцтва Саюз беларускіх архітэктараў? Што робіцца архітэктарамі Беларусі па планіроўцы калгасных вёсак, па праектаванню калгаснага жылля, калгасных школ, клубаў, дзіцячых яслянь, калгасных лазняў, гаражоў і іншых пабудоў? На-жаль, нічога не робіцца.

— Правялі конкурс, — скажуць нам у Саюзе архітэктараў, — і толькі.

Наркамземам БССР выдан друкаваны альбом праектаў калгаснага жылля, клубаў і іншых калгасных пабудоў. Але якая якасць гэтых выбраных для альбома 20-ці праектных работ з 55 праектаў, паступіўшых на конкурс? Аб гэтым зараз ні ў Наркамземе, ні ў Саюзе архітэктараў не гаворыць.

А якасць альбома не можа не звярнуць на сябе ўвагі. Альбом гэты рэкламаваўся воратамі пароча, арудаваўшымі ў Наркамземе БССР. Многія з праектаў склаўшы без належнага ведання запросаў калгаснікаў, механічна капіруюць планіроўку гаралскіх кватэр.

Здавалася-б, тыраж гэтага альбома даўно пара знець, перагледзець занава ўсе матэрыялы конкурса, і калі знойдзецца дастатковая колькасць станоўчых праектаў, — выдаць новы альбом. А ў Наркамземе БССР абмежаваліся тым, што пад уступным артыкулам сцёрлі ў альбомах, якія ў іх ёсць, прозвішчы ворага народа, і ўсё. Аб школьніцкім альбоме Саюз архітэктараў і яго праўленне забылі.

Пасля конкурса прайшло паўтара года. За гэты час ні адзін з архітэктараў у Беларусі не працаваў над праектамі калгасных пабудоў. Тлумачэнне простае: архітэктары лічаць калгаснае праектаванне «маладахоўным». Ці варта вазіцца з нейкім маленькім калгасным домікам, ці калгаснай лазняй. Куды лепш і выгаднейшы зрабіць праект небаскроба ці гаралскога кінотэатра! Толькі кіруючыся гэтымі рвачкімі мерказаннямі Белдзяржпраект, напрыклад, наогул адмаўляецца ад праектавання калгасных пабудоў.

Што-ж датычыць самога Наркамзема, то пры ім яшчэ да гэтага часу не створан архітэктурна-праектны аддзел, або архітэктурна-праектная майстэрня.

Гэта няўважлівасць архітэктурнай грамадскасці да калгаснай планіроўкі і будаўніцтва ўжо прывяла некаторыя раёны да вялікіх непрыемнасцей. У вельмі многіх выпадках калгасныя вёскі забудоўваюцца хаатычна, на стары лад. Калгасныя дамы будуюцца па прымітыўных «праектах» мясцовых несляроў.

У Дуброзенскім раёне ў калгасе «Кастрычнік», напрыклад, калгаснікі рашылі перасяліцца з хутароў, каб жыць у адной вёсцы. І што-ж? Для гэтага выбіраецца пляцоўка старой вёскі і забудова ажыццяўляецца па старому плану. Вуліца атрымалася крывой і вузкай. Ва ўсім гэтым, зразумела, не цяжка разглядзець вынікі варожай работы, арудаваўшых у сістэме Наркамзема фашысцкіх бандытаў. Добрую ідэю перасялення калгаснікаў з хутароў у вёскі яны, фашысцкія шпіёны і дыверсанты, ажыццяўлялі такім чынам, каб ўсякімі сродкамі выклікаць нездавальненне насельніцтва.

Газорка ідзе не толькі аб тым, каб у бліжэйшы час прыцягнуць да калгаснага праектавання нашых архітэктараў, каб нашы архітэктары выязджалі ў раёны, у калгасы і дапамагалі калгаснікам культурна планаваць новую калгасную вёску, культурна будаваць. Газорка ідзе аб тым, каб уся гэта работа ажыццяўлялася і з належным улікам пагранічнага становішча нашай рэспублікі. Гэта прад'яўляе асаблівыя патрабаванні да планіроўкі калгасных забудоў, да планіроўкі артэзіянскіх калодзежаў, санітарных, процівапажарных і іншых сельскіх устаноў. Аб гэтым павінны добра памятаць як самі архітэктары, так і раённыя кіруючыя работнікі.

Культурныя запросы калгасных мас нязмерна ўзраслі. У многіх калгасных кватэрах з'явілася гаралская мэбля, патэфон, кніжная бібліятэчка, радыёпрыёмнік і мастацкія карціны. Якой павінна быць планіроўка калгаснай кватэры? Як лепш размясціць у кватэры і бібліятэчку і масу іншых, неабходных у калгасным ужытку хатніх рэчаў? Якой павінна быць найбольш зручная ўвязка жылога дома з двуром і надворнымі пабудовамі? Для ўсяго гэтага неабходна, каб нашы архітэктары непасрэдна ў калгасным быту вывучалі запросы калгаснай сям'і, сур'ёзна працавалі-б над стварэннем праектаў прыгожага і выгаднага калгаснага жылля.

У святле ўсяго сказанага асабліва востра пазінна быць пастаўлена пытанне і аб падрыхтоўцы калгасных будаўнічых кадраў у нашай рэспубліцы, — калгасных будаўнічых брыгадзіраў, сталяроў, песлярoў і каменшчыкаў, а таксама і пытанне аб вырабе на месцы, у калгасах, будаўнічых матэрыялаў — піленага лесу, цэглы і чарапіцы.

Больш увагі да калгаснай архітэктуры. Нашы архітэктары абавязаны паклапаціцца аб тым, каб планіроўка калгасных вёсак, архітэктура калгаснага жылля былі такімі-ж прыгожымі, як выдатна калгасная праца і нашы выдатныя калгасныя людзі.

А. ДАЛІН.

АБМЕРКАВАННЕ ПРАЕКТА АБ УВЯДЗЕННІ ПРАВІЛЬНЫХ СЕВАЗВАРОТАЎ

АБ СЕВАЗВАРОТАХ У СОЎГАСАХ

У праекце камісіі Народнага камісарыята земляробства Саюза ССР і Народнага камісарыята зернавых і жывёлагадоўчых соўгасаў Саюза ССР «Аб увядзенні правільных севазваротаў» запісана: «Шырока ўвесці як у жывёлагадоўчых, так і зернавых соўгасах травапольныя севазвароты з тым, каб соўгасы сталі ўзорам для калгасаў у справе вядзення правільных севазваротаў».

Неабходна разглядзець, ці задавольваюць гэтаму патрабаванню раней зацверджаныя Наркомсоўгасаў Саюза ССР севазвароты соўгасам БССР.

У большасці свінасоўгасаў існуе два севазвароты: а) прыфермскі ці кармовы і б) палявы ці зернафуражны. Палявыя севазвароты ў значнай частцы свінасоўгасаў шасціпольныя, пяціпольныя і ёсць сямі-васьмі- і дзевяціпольныя.

Ворагі народа прыклалі ўсе свае намаганні, каб нанесці ўдар і па гэтаму важнейшаму ўчастку соўгаснага будаўніцтва. Яны пусцілі ў ход «тэорыю» аб неабходнасці вузкай спецыялізацыі соўгасаў. Выходзячы з гэтай «тэорыі», у свой час давозіліся планавыя заданні, у рэзультаце чаго пры ўстанаўленні севазвароту штучна драбіліся палі на асобныя кавалкі, павялічваючы колькасць рабочых участкаў.

Пяці- і шасціпольныя севазвароты ў свінасоўгасах з 30—50 проц. у полі шматгадовых траў і з'яўляюцца вынікам рук ворагаў і дыверсантаў. У гэтых севазваротах шматгадовыя травы пры 50 проц. траў у полі павінны вырошчвацца на поле праз 10—12 год, а пры 30 проц. траў — праз 15—18 год. Гэта затармазіла павышэнне ўраджайнасці глебы і ўраджайнасці культур і адначасова значна паларвала кармовую базу соўгасаў. Таму ў апошнія годы, укараняючы ў свінасоўгасы буйную рагатую жывёлу, а ў жывёлагадоўчыя соўгасы — свіней, аказалася, што значная частка соўгасаў адчувае востры недахват грубых кармоў.

Другім недахопам усіх існуючых севазваротаў з'яўляецца адсутнасць чорных папараў і вялікі пропант занятых папараў. У асобных севазваротах у папаравым кліне змяшчаўся нават ячмень. У выніку гэта прыводзіла да вялікага засмечання глебы.

У васьмі- і дзевяціпольных севазваротах мы маем паступныя недахопы: палова поля канюшынішча скарыстоўваецца пад азімыя, што з'яўляецца нерацыянальным. Для азімых травы з'яўляюцца лепшым папярэднікам, але ў даным выпадку раннее ворыва канюшынішча пад азімыя прыводзіць да хуткага разлажэння накапіўшайся арганічнай матэрыі за некалькі год. У рэзультаце звозіцца к нулю роль травянога поля на наступныя культуры пасля азімых. Акадэмік Вільямс гаворыць, што «Азіміна па траве — найбольш яркае выражэнне агратэхнічнай нграматнасці».

Травяны пласт у васьміпольных севазваротах скарыстоўваецца зернавымі культурамі толькі адзін год, а ў дзевяціпольных севазваротах — два гады, а потым адводзіцца пад папаравае поле. Пры такім скарыстанні травянога пласта станоўчая роль травасеяння, як фактара, спрыяючага павышэнню ўраджайнасці культур і аднаўленню структуры і ўрадлівасці глебы, зводзіцца да мінімума і з'яўляецца малаэфектыўнай для гаспадаркі.

Пасля канюшынішча неабходна гэту плошчу скарыстоўваць аднагадовымі раслінамі мінімум на працягу 3—4 год, а потым адводзіць пад папаравае поле. Наступным недахопам з'яўляецца тое, што травы на полі змяшчаюцца на пяты год пасля папару, што прыводзіць да засмечання апошніх і зніжэння ўраджайнасці.

Акадэмік Вільямс рашуча пярэчыць супроць пасеву траў пад яравыя і рэкамендуе рабіць пасеў толькі пад азімыя, прычым цімафееўку высяваць адначасова з сяўбой азімых, а канюшыну ранняй вясной па азіміне. У рэзультаце чаго ў першы год карыстання траў атрымліваецца ўраджай вышэй, чым пры пасеве апошніх пад яравыя.

Такім чынам, у большасці ўведзеныя і ўводзімыя ў соўгасах да гэтага часу севазвароты не толькі не спрыялі аднаўленню структуры і павышэнню ўрадлівасці глеб, але і наносілі шкоду справе ўздыму ўраджайнасці.

Як-жа ў даны момант павінны быць зменены севазвароты ў соўгасах?

У праекце «Аб увядзенні правільных севазваротаў» сказана: «У тых свінасоўгасах, у якіх існуюць севазвароты з шматгадовымі травамі, севазваротаў не змяняць, а забяспечыць пасевы траў у адпаведнасці з прынятымі севазваротамі. У тых свінасоўгасах, якія не маюць травапольных севазваротаў, увесці іх шляхам падзелу кожнага поля прынятага севазвароту на два палі і забеспячэння не менш двух палёў пад шматгадовымі травамі».

З другой часткай гэтага пункту згадзіцца нельга. Як відаць з прыведзеных вышэй схем існуючых севазваротаў, мы маем значную частку соўгасаў з шасціпольнымі і пяціпольнымі севазваротамі, з паловай ці нават меншай часткай паловы поля траў. Калі ў гэтых севазваротах разбіць палі напалову, то мы атрымаем вельмі грамоздкія дзесяці- і дванаццаціпольныя севазвароты з малымі палямі і травы будуць зварачацца на ранейшае поле толькі праз 8—10 год. Пакінуўшы-ж іх пяці- і шасціпольнымі з двума палямі траў — мы вымушаны будзем значна скараціць зернавыя культуры і, апрача таго, канюшына будзе варочацца праз тры гады, што недапушчальна.

Пры ўвядзенні ў сучасны момант правільных травапольных севазваротаў у соўгасах павінна быць пакладзена ў аснову наступнае: у тых соўгасах, у якіх існуюць травапольныя сямі-, васьмі- і дзевяціпольныя севазвароты, іх пакінуць, але пераглядзеўшы чаргаванне культур.

Існуючыя параправашныя севазвароты, як вядучыя да разбурэння структуры і распылення глебы і незабяспечваючыя ўстойлівых і высокіх ураджаяў, замяніць ва ўсіх без выключэння соўгасах травапольнымі севазваротамі, разбіўшы палі пры чатырохполлі напалову.

Усе пяціпольныя і шасціпольныя севазвароты замяніць сямі-, васьмі- ці дзевяціпольнымі.

Лічыць мэтазгодным у кожным травапольным севазвароце мець два палі шматгадовых траў, дапусціўшы ў тых соўгасах, якія поўнасцю забяспечаны натуральнымі лугавымі ўгоддзямі, адно поле траў, а ў якіх адсутнічаюць натуральныя лугавыя ўгоддзі — тры палі шматгадовых траў.

Усе соўгасы, у якіх палявыя ўгоддзі размешчаны ў некалькіх асобных масівах ці ў адным масіве, але палі аддалены ці сязібы на значную адлегласць — павінны мець два севазвароты: а) кармовы (прыфермскі) і б) палявы (зернафуражны).

Назначэнне кармовага севазвароту забяспечыць пагалоўе зялёным вітамінным кормам і пасьбішчам для свінапагалоўя і малалняка буйнай рагатай жывёлы. У ім павінны змяшчацца і сочныя кармы — кармовыя карнеплоды, сілосныя культуры, аднагадовыя травы на зялёны корм і выпас, шматгадовыя травы са скарыстаннем першага года карыстання на зялёны корм, а ў наступныя гады — на выпас.

Увядзенне прыфермскага травапольнага севазвароту вызваляе соўгас ад непрадукцыйных затрат па перавозцы кармоў, якія ўтрымліваюць вельмі высокі пропант вады.

Размер кармовага севазвароту будзе залежаць ад планавага задання па пагалоўю.

У палявым травапольным севазвароце ні пад якім повадам не можа дапускацца пасьба жывёлы на травяным полі, бо: «самы разбуральны фактар, які знішчае структуру глебы і яе трываласць — пасьба жывёлы, асабліва дробнай і яшчэ ў большай ступені хатняй птушкі, незалежна ад становішча вільготнасці глебы» (акадэмік Вільямс).

Паколькі прыфермскі севазварот па свайму размеру не можа забяспечыць пасьбішчам ларослае пагалоўе буйнай рагатай жывёлы, таму кожны соўгас павінен мець асобна штучныя культурныя пасьбішчы, закладваемыя ў асноўным за кошт малапрадукцыйных натуральных пасьбішч і бросавых зямель.

Пытанне аб парадку размяшчэння і чаргавання культур у травапольным севазвароце мае вельмі буйнае значэнне. У даным выпадку неабходна мець на ўвазе паступнае: у папаравым кліне адначасова з чорным папарам павінен быць шырока ўжыт і пасеў лубіну на зялёнае ўгнаенне, з наступнай запашкай. Занятыя папары з сяўбою аднагадовых траў на сена ці зялёны корм дапусціць толькі ў прыфермскіх севазваротах. У палявым севазвароце, як правіла, папаравае поле адыходзіць пад чорны папар і лубін — на зялёнае ўгнаенне.

Пасеў шматгадовых траў праводзіць пад азімыя культуры, а не пад яравыя, прычым цімафееўка высяваецца восенню адначасова з сяўбой азімых, а канюшына — праз зіму — ранняй вясной.

Поле пасля шматгадовых траў скарыстоўваць не менш трох год пад аднагадовымі культурамі, і пасля чаго адводзіцца пад папар.

Не могуць быць размешчаны непасрэдна пасля травянога поля: аднагадовыя бабовыя культуры, прапашныя і азімыя. Лепшай раслінай, якая ідзе непасрэдна пасля траў, з'яўляюцца яравая пшаніца і ячмень.

Выходзячы з вышэйпаказанага, можна рэкамендаваць, як тыповую, схему палявога севазвароту: 1) папар чорны і лубінавы, 2) азімыя з пасевам траў, 3) травы на сена, 4) травы на сена, 5) яравая пшаніца, ячмень, 6) прапашныя, 7) бабовыя (гарох, віка), 8) авёс.

У соўгасах, забяспечаных натуральнымі сенажацямі, можна пакінуць адно поле пад травамі.

У соўгасах, не маючых натуральных сенажацяў і не забяспечаных грубымі кармамі пры двух палях шматгадавых траў, можна дапусціць тры палі траў. Тады будзем мець дзевяціпольны севазварот.

У даных севазваротах арганічнае ўгнаенне (торф, гной) уносіцца ў чорны папар і прапашнае поле. Кожная культура мае найлепшы папярэднік: бабовыя на зярно змешчаны пасля прапашных, што дасць магчымасць атрымаць высокія ўраджаі апошніх. Замыкаючай культурай у севазвароце з'яўляецца авёс, які змешчан на адным з лепшых папярэднікаў (бабовыя).

Схема прыфермскага севазвароту можа быць прапанавана такая: 1) віка-авёс на выпас і зялёны корм, 2) азімыя зернавыя з пасевам траў, 3) канюшына на зялёны корм, 4) канюшына на выпас, 5) ячмень, 6) сілос, карнеплоды.

Севазварот — сродак выканання планавых заданняў. Правільным севазваротам будзе толькі той, які забяспечвае выкананне дзяржаўнага планавага задання, і слепа капіраваць указаныя схемы севазваротаў ва ўсе соўгасы было-б грубейшай памылкай. Устанаўленне для соўгаса севазвароту — надзвычай важная і адказнейшая залача, і справа гэта не толькі агранома, а ўсяго калектыва соўгаса.

У парадку дадатку ў праект аб увядзенні правільных севазваротаў неабходна ўвесці раздзел аб некаторых абавязковых, хоць-бы асобных, найбольш важных агратэхнічных мерапрыемствах, непасрэдна звязаных з травапольнай сістэмай земляробства, як: 1) у трэцяй пяцігодцы давесці глыбіню ворнага пласта не менш чым на 20 см.; 2) перайсці на культурнае ворыва — плугам з перадплужнікам; 3) лучшэнне жніўя павінна стаць пераэрыўнай аперацыяй з наступным зяблевым ворывам; 4) пераход ад ранніх чыстых папараў да чорных, правадзімых з восені, і рад іншых мерапрыемстваў.

Тады кожны соўгас, кожны калгас атрымаюць у рукі баявы план барацьбы за далейшы сістэматычны ўздым ураджайнасці, стварэнне моцнай кармовай базы для сацыялістычнай жывёлагадоўлі, і мы атрымаем яшчэ большае багацце прадуктаў у нашай краіне.

Агранам БАБІЦКІ.

ПЕРАДКАСТРЫЧНІЦКАЕ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ СПАБОРНІЦТВА

НОВЫЯ АТРАДЫ ПРАЦОУНЫХ УКЛЮЧАЮЦЦА Ў СПАБОРНІЦТВА

РЫХТУЮЦЦА ДА СВЯТА

Зварот калгаснікаў сельгасарцелей імя Дзержынскага і «Чырвоны хлебароб» аб разгортванні перадкастрычніцкага спаборніцтва знайшоў жывы водгук сярод калгаснікаў Полацкага раёна. Члены арцелі імя Першага з'езда калгаснікў-ударнікаў актыўна ўключыліся ў перадкастрычніцкае спаборніцтва.

Калгас у гэтым годзе атрымаў высокі ўраджай. Кожны гектар жыта дае ў сярэднім 18 цэнтнераў зярна, а ўраджай бульбы даходзіць да 300 цэнтнераў.

Уключыўшыся ў перадкастрычніцкае спаборніцтва, калгаснікі ўзялі канкрэтныя абавязацельствы: у бліжэйшыя дні кончыць зяблевае ворыва. Больш паловы пал зяблева ўжо ўзарана. Уборку бульбы мяркуюць скончыць не пазней 5 кастрычніка. Калгас і калгаснікі першымі па раёну яшчэ ў жніўні разлічыліся з дзяржавай па бульбапастаўках. На ўборцы бульбы працуюць лепшыя калгасніцы, якія спаборнічаюць паміж сабой.

Да свята ў калгасе будзе поўнасцю скончан абмалот і засыпка насенных фондаў. Калгаснікі абавязаліся здаць дзяржаве лён не пазней 15 кастрычніка. Большасць трасты падчята са спелішч. Калгас ужо здаў на ільназавод 873 кілограмы трасты. На сартаванні штодзень працуюць 17 калгасніц.

Разгорнута перадкастрычніцкае спаборніцтва ў калгасе «Чырвоная Сякераўшчына», Громаўскага сельсовета. Багаты ўраджай поўнасцю сабран і беражліва ахоўваецца. На працадні калгаснікі атрымліваюць у азанс па кілограму жыта, 11 кілограмаў бульбы, 3 кілограмы грубых кармоў і 1 р. 25 к. грашыма. Сям'я калгасніка Бондарава за 9 месяцаў мае 700 працадзён. Яна атрымлівае авансам 700 кілограмаў збожжа, 875 руб., 2.100 кілограмаў сена і 7.700 кілограмаў бульбы. Да пачатку размеркавання прыбыткаў гэта лічба значна ўзрасце.

Палова бульбы ў калгасе ўжо выбрана з поля. На ўборцы працуюць лепшыя звенні капальшчыц. Да 5 кастрычніка калгаснікі абавязаліся кончыць капанне бульбы і ворыва зяблева.

Калгаснікі Таранкоў Хведар і Секалаў Аляксей да свята канчаюць будаўніцтва новых хат. Калгаснікі рамантуюць свае хаты.

Добры ўраджай атрымалі сёлета калгаснікі калгаса імя Кірава, Экіманскага сельсовета. Атрымаўшы авансы, калгаснікі набываюць да свята каштоўныя рэчы. Калгаснік Юшкевіч купіў для сваёй сям'і новае святочнае адзенне. Многія калгаснікі маюць на мэце купіць да свята канапы і іншыя хатнія рэчы.

Ал. ЖЫХАРАЎ.

Калгаснікі Віцебскага раёна хутка адгукнуліся на зварот калгаснікаў калгасаў імя Дзержынскага, Лагойскага раёна, і «Чырвоны хлебароб», Гомельскага раёна, аб перадкастрычніцкім соцспаборніцтве калгасаў БССР. НА ЗДЫМКУ: брыгадзір калгаса «Звязда» тав. Аляксеенка П. Н. чытае сваёй брыгадзе зварот гэтых калгасаў. Брыгада тав. Аляксеенка заключыла соцдагавор з брыгадай тав. Карначова гэтага-ж калгаса.
Фото Лупейка (БСФ).

АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВЫ ВЫКАНАЕМ

Наша фабрыка імя Куйбышэва за першае паўгоддзе выканала план на 107,5 проц. Але гэта не значыць, што ў нас усё добра.

У нас вельмі многа недахопаў і многа было шкодніцтва. Да нас дырэктарам быў прыслан ворагам народа. Гэты чалавек зрываў стаханаўскі рух і выкананне плана. У рэзультаце ў ліпені мы выканалі план толькі на 93,3 проц. У момант перагляду норм, адпускной кампаніі і падпіскі на пазыку гэты «дырэктар» пабаяўся труднасцей, пайшоў у адпачынак і пакінуў фабрыку.

Шкодніцтва было ў нас і ў адносіне бытавых умоў рабочых. Пабудавалі яслі, і не зрабілі пральні, пачалі будаваць новы фабрычны корпус, за 2 гады вывелі толькі адзін паверх, і на гэтым скончылі.

Ворагі народа — шпіёны былі і на нашай фабрыцы. Быў выкрыт як шпіён начальнік тарыфна-нармівочнага бюро. Гэты мярзавец доўгі час умела маскіраваўся. А на справе аказалася, што ён шпіён, закляты вораг народа.

Але я павінен сказаць, што мы яшчэ дрэнна прыглядаемся да людзей. Мы не выкрылі ўсіх ворагаў, якія ёсць і на нашай фабрыцы. Словы таварыша Сталіна аб капіталістычным акружэнні патрэбна заўсёды памятаць.

На сённяшні дзень у нас ёсць 342 стаханаўцы, якія перавыконваюць нормы. Але ўлік у нас дрэнна пастаўлен. Мы не ведаем — хто колькі перавыконвае. Гэта сведчыць аб пагарджальных адносінах дырэкцыі і грамадскіх арганізацый да важнейшай справы. Не пікавяцца стаханаўцамі трэст і наркамат. Яны зусім не клапоцяцца аб забеспячэнні рабочых фабрыкі патрэбнымі матэрыяламі (замкі, скрэпкі і інш.).

У сувязі з падрыхтоўкай да 20-й гадавіны Вялікай Кастрычніцкай рэволюцыі наша фабрыка ўзяла на сябе наступныя абавязацельствы: да кастрычніцкага свята даць дзяржаве прадукцыі звыш плана на 200 тысяч рублёў, даць эканоміі сыроды 200 тысяч дэцыметраў, значна павысіць якасць. Свае абавязацельствы мы пачалі выконваць. Мы, стаханаўцы фабрыкі, патрабуем ад гарбарні «Большэвік» лепшай якасці скуры з тым, каб мы маглі выпускаць прыгожыя, эграбныя, скургалантарэйныя вырабы.

Хутка пачынаюцца выбары ў Вярхоўны Совет. У нас на фабрыцы арганізаваны гурткі па вывучэнню Палажэння аб выбарах. Ахоплена гэтымі гурткамі 550 чалавек. Па маёй думцы, тут яшчэ ёсць буйныя недахопы. Многія не ведаюць добра Палажэння аб выбарах. З жонкамі рабочых не арганізавана вывучэнне. У нас ёсць работніцы-адзіночкі, якія маюць дзяцей, але э імі асобна палітычная работа не праводзіцца. Партарганізацыя павінна ўлічыць гэта.

У нас на фабрыцы ў сувязі з падрыхтоўкаю да галавіны Кастрычніцкай рэволюцыі разгарнулася соцыялістычнае спаборніцтва паміж цэхамі, групамі і асобнымі рабочымі. Група таз. Перкельвальда выклікала на соцспаборніцтва групу бумажнікаў. Група майстра Флаксмана выклікала на соцспаборніцтва групу майстра Савінай. Майстар Голад выклікаў на соцспаборніцтва майстра Ясіноўскага. Усе гэтыя групы пачалі перавыконваць свае планы. Заключана 390 індывідуальных дагавораў. Мы цяпер на фабрыцы пачалі рыхтавацца да стаханаўскага дэкадніка, і ўпэўнены, што ўсе нашы абавязацельствы, якія ўзялі да Кастрычніка, перавыканаем.

Я сама абавязваюся выканаць норму на 150 проц. і бяру шэфства над адстаючымі рабочымі — Алексіонак і Розінай з тым, каб яны сталі стаханаўцамі.

СІМОН Э. Г.
Стаханаўка ф-кі імя Куйбышэва.

КОНЧЫЛІ ЗДАЧУ ІЛЬНАПРАДУКЦЫІ

Калгасы Шклоўскага раёна імя Кірава, «XII-годзе Кастрычніка», імя Леніна, «Новае жыццё», «Перамога» і імя Свердлова кончылі здачу ільнапрадукцыі дзяржаве па кантрактацыйных дагаворах. Здадзена ільнавалакна высокай якасці ў сярэднім 14,7, 12,8, 13 і 11,5 нумарамі (план 9,5—10,5). Траста таксама добраякасная.

В. КАВАЛЬЧУК.

У СОЦСПАБОРНІЦТВА ЎСТУПАЮЦЬ ЛЯСНІКІ

Рабочыя, інжынерна-тэхнічныя работнікі і служачыя Брыцалавіцкага лесапункта, Асіпавіцкага раёна, уключыўшыся ў соцыялістычнае спаборніцтва на дастойную сустрэчу XX гадавіны Кастрычніка, звярнуліся з пісьмом да ўсіх рабочых, інжынерна-тэхнічных работнікаў і служачых лясной прамысловасці Беларусі.

У сваім звароце яны пішуць:

— Нашы кіруючыя апараты яшчэ працуюць па-бюракратычнаму. Вельмі часта машыны, якія знаходзяцца ў лесе, прастайваюць. Вагоны адпраўляюцца са складаў нягружанымі. Ёсць зышадкі, калі ворагі калечаць і забіваюць людзей. У лесе гніюць вялікія багацці, а планы, з кварталу ў квартал не выконваюцца, заводы працуюць з перабоямі.

Выгнаць усіх шкоднікаў і дыверсантаў з лясной прамысловасці, увесці ва ўсе галіны работы рацыяналізаваныя інструменты, якіх у нас ёсць у дастатковай колькасці, разгарнуць стаханаўскі рух— вось нашы задачы.

Да XX гадавіны Кастрычніка рабочыя, інжынерна-тэхнічныя работнікі і служачыя Брыцалавіцкага лесапункта абавязаліся выкапаць цалкам гадавы план і зрабіць увесь лесапункт стаханаўскім. Давесці дзённыя нормы па загатоўках замест плана — 3,72 кбм. да 5,5 кбм., па вывазцы — замест плана 2,21 кбм. да 4,5 кбм.

Л. С.

СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ СПАБОРНІЦТВА БАЙЦОЎ І КАМАНДЗІРАЎ ПАЖАРНАЙ АХОВЫ

Байцы і камандзіры пажарнай аховы НКВД уключаюцца ў перадкастрычніцкае соцыялістычнае спаборніцтва. Нядаўна адбыўся агульнагарадскі сход работнікаў мозырскай пажарнай аховы, на якім абмяркоўвалася пытанне падрыхтоўкі да 20-годдзя Вялікай Кастрычніцкай рэволюцыі. Байцы і камандзіры ўзялі на сябе рад канкрэтных абавязацельстваў аб узмацненні пільнасці, баявой і палітычнай падрыхтоўцы, па барацьбе з пажарамі і т. д. Яны выклікалі на соцыялістычнае спаборніцтва работнікаў рэчыцкай пажарнай аховы.

844 ТОНЫ НА МАЛАТАРНЮ

Ордэнаносец-малацільшчык з Хойніцкай МТС тав. **Свірыд Кандрат** дастойна сустракае XX гадавіну Кастрычніцкай рэволюцыі. На малатарні «МК-1100» ён намалаціў 716 тон. Да канца сезона тав. Свірыд мяркуе намалаціць не менш 1.500 тон збожжа.

Выпрацоўку малацільшчыка Свірыда пераконвае яго вучань тав. Віннік, які намалаціў ужо 844 тоны на сваю малатарню. Спаборніцтва сярод малацільшчыкаў шырыцца.

М. КУРАПЕЙ.

ДА СВЯТА САБРАЦЬ УЗНОСЫ ПА ПАЗЫЦЫ

Актыўна ўключыўшыся ў перадкастрычніцкае спаборніцтва, многія ўпаўнаважаныя сельскіх советаў па Пазыцы ўмацавання абароны Саюза ССР дабіліся датэрміновага і поўнага збору ўзносаў з калгаснікаў і калгасніц.

Упаўнаважаныя Шэйскага сельсовета, Крупскага раёна, Каралёў Іван (калгас імя Дзержынскага), Ксяндзоў Дзмітрук (калгас «Чырвоны сцяг»), фінактывіст Печарыца Антон і інш. першымі ў рэспубліцы сабралі поўнасцю грошы на суму ў 13 тысяч рублёў.

Упаўнаважаныя Герасімовіч Сямён (калгас імя Дзержынскага, Менскага раёна) сабраў 4.295 руб., Падабед Іван (калгас «Прамень социялізма»)—2.440 руб., Лаптух Іван (калгас «Чырвоная воля», Гомельскага раёна) — 2.240 руб., Самусёў Рыгор, Кавалёў Сяргей, Емельянаў Кірыл (калгас «Камінтэрн», Магілёўскага раёна) — 9.440 руб. і інш.

Наркамфін БССР і Кіраўніцтва ашчадкасамі і дзяржкрэдыта за вялікую актыўнасць па збору ўзносаў і падпісцы на пазыку прэміравала грашыма 54 лепшых упаўнаважаных сельскіх советаў на суму 5000 руб. Усяго прэміравалі актывістаў па 29 раёнах.

Усе ўпаўнаважаныя сельсоветаў па пазыцы, селькамсолы і фінансавы актыў павінны паследаваць прыкладу гэтых таварышоў. Шырокай арганізацыйна-масавай работай і разгортваннем перадкастрычніцкага спаборніцтва яны павінны дабіцца да XX гадавіны Кастрычніка поўнага датэрміновага збору ўзносаў па пазыцы сярод калгаснікаў і працоўных адпаасобнікаў.

ПЕРЭЛЬМАН.

ПАСТАНОВА ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА СССР

Дзеючым крымінальным законадаўствам СССР і саюзных рэспублік для барацьбы з шпіянажам, шкодніцтвам, са спробамі арганізацыі ўзрываў, крушэнняў, нападаў з чалавечымі афярамі і інш. дыверсійных актаў устаноўлены ў якасці мер крымінальнага пакарання — пазбаўленне волі на тэрмін не звыш 10 год, а для найбольш цяжкіх відаў дзяржаўных злачынстваў — вышэйшая мера пакарання (расстрал).

У мэтах далейшай барацьбы з такога роду злачынствамі і прадастаўлення суду магчымасці выбіраць па гэтых злачынствах не толькі вышэйшую меру пакарання (расстрэл), але і пазбаўленне волі на больш працяглы тэрмін, Цэнтральны Выканаўчы Камітэт СССР **пастанаўляе:**

1. У змену арт. 18 «Асноўных пачаткаў крымінальнага законадаўства СССР і саюзных рэспублік» устанавіць у якасці меры крымінальнага пакарання пазбаўленне волі на тэрмін не звыш 25 год.

2. Прапанаваць Цэнтральным Выканаўчым Камітэтам саюзных рэспублік прывесці сваё законадаўства ў адпаведнасць з гэтай пастановай.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта СССР
М. КАЛІНІН.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта СССР
А. ГОРКІН.

Масква, Крэмль,
2 кастрычніка 1937 г.

РЫХТУЮЦЦА ДА ВЫБАРАЎ У ВЯРХОЎНЫ СОВЕТ

Партыйныя арганізацыі Менска за апошні час узмацнілі падрыхтоўку да выбараў у Вярхоўны Совет СССР.

На 81 выбарчы ўчастак разбіт горад. З іх 35 выбарчых участкаў прымацаваны да Кагановіцкага, 29 да Варашылаўскага і 17 да Сталінскага райкомаў КП(б)Б. Падабраны адказныя таварышы для разгортвання палітычна-масавай работы на выбарчых участках. Апрача гэтага, да кожнага выбарчага ўчастка прымацаваны па 2—3 партыйныя арганізацыі. Прымацаванне праведзена па па тэрытарыяльнаму прынцыпу. Амаль усюды падабраны памяшканні—пэнтры выбарчых участкаў.

Зараз ва ўсіх партарганізацыях горада праходзіць падбор агітатараў для растлумачэння Палажэння выбарщчыкам вызначанага ўчастка.

Да 24 выбарчага ўчастка (раён Серабранкі і Чырвонаармейскай) прымацаваны калектыв фабрыкі «Комунарка» і ТЭЦ.

На фабрыцы «Комунарка» праведзены па гэтаму пытанню гутаркі па цэхах. Вылучана 30 падрыхтаваных і аўтарытэтных на фабрыцы агітатараў. Сярод іх: дэпутат горсовета т. Радкевіч, брыгадзір-электратэхнік т. Лісоўскі, зменны майстар Мядзведзева, інжынер Палеес і інш. Для агітатараў арганізован семінар. Яны прыступаюць да азнаямлення з жыхарамі дамоў, дзе яны будуць кіраваць гуткамі (прыкладна адзін чалавек на 10 дамоў). Вылучана таксама 8 чалавек для арганізацыйнай работы.

На тэрыторыі фабрыкі будзе пэнтэр гэтага выбарчага ўчастка. Памяшканне выбарчага ўчастка будзе прыгожа афарбавана, заслана дыванамі, радыёфікавана

АГІТМАСАВУЮ РАБОТУ ЯШЧЭ НЕ АРГАНІЗАВАЛІ

Аршанскі РВК і прэзідыум горсовета зацвердзілі па гораду Оршы 16 выбарчых участкаў.

Участак з найбольшай колькасцю насельніцтва налічвае 1.890 чалавек і з найменшай — 1.570. Самастойным выбарчым участкам з'яўляецца будаўніцтва ільнакамбіната, які налічвае 1.500 чалавек. Падабраны найлепшыя памяшканні для выбарчых участкаў: гортэатр, аэраклуб, клуб ПВХО, педтэхнікум, клубы прадпрыемстваў: мясакамбіната, мехзавода, арцелі «Дняпро», а таксама лепшыя памяшканні сярэдніх школ.

Дасканала вызначаны вуліцы, якія ўваходзяць у кожны выбарчы ўчастак.

У мэтах стварэння найбольшых выгад для выбаршчыкаў улічвалася адлегласць да памяшкання, дзе будуць адбывацца выбары.

У бліжэйшыя дні горсовет заканчвае складанне папярэдніх спісаў выбаршчыкаў.

Для апаратыўнага кіраўніцтва работай па выбарах у Вярхоўны Совет як у часе падрыхтоўкі, так і ў часе правядзення выбараў прэзідыум горсовета прымацаваў членаў прэзідыума і актыў горсовета да кварткомаў (іх у горадзе 12) і прадпрыемстваў. Задачы гэтых таварышоў—весці штодзённую работу па падрыхтоўцы выбаршчыкаў свайго ўчастка да выбараў, па арганізацыі вывучэння выбарчага закона, асабліва сярод неарганізаванага насельніцтва. Пры кварткомах створаны гурткі па ліквідацыі непісьменнасці.

Сур'ёзным недахопам у рабоце горсовета з'яўляецца тое, што дагэтуль не наладжана як след работа гурткоў па вывучэнню выбарчага закона, асабліва ў жактах, сярод хатніх гаспадынь і іншых груп насельніцтва; не наладжана яшчэ праверка работы кожнага агітатара і бяседчыка.

Шчыльна за агітацыйна-масавую работу ў шырокіх колах неарганізаванага насельніцтва мы яшчэ не ўзяліся. Між тым, ёсць паасобныя сігналы аб варожай дзейнасці класава-варожых элементаў. Так, у горадзе, за Дняпром поп ноччу абыходзіць дамы і дапытваецца ў жыхароў, за каго яны будуць галасаваць у Вярхоўны Совет.

І яшчэ адзін сур'ёзны недахоп — гэта слабая работа секцый горсовета і дэпутацкіх груп. Зусім відавочна, што ўзняцце работы такіх секцый, як комунальная, бытавая і іншая, з'яўляецца вельмі важным момантам у падрыхтоўцы да выбараў.

7 кастрычніка арганізуецца гутарка з маладымі выбаршчыкамі, якім споўняецца 18 год і якія ўпершыню будуць прымаць удзел у выбарах.

Н. К. ШЧЭРБА,
старшыня Аршанскага горсовета.

213 ГУРТКОЎ ПА ВЫВУЧЭННЮ ВЫБАРЧАГА ЗАКОНА

МАГІЛЕЎ. Для лепшага ўсваення выбарчага закона Магілеўскі гарком партыі сумесна з горсоветам арганізуе гурткі, у якіх будзе вывучацца «Палажэнне аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР». Для рабочых і служачых горада арганізуецца 213 гурткоў. Апрача таго, 59 гурткоў арганізуецца пры школах. У гэтых гуртках выбарчы закон будуць вывучаць мацеры вучняў. Столькі-ж гурткоў арганізуецца пры жактах. У іх будуць вызучаць выбарчы закон усе хатнія гаспадыні і ўсё астатняе насельніцтва.

Для кіраўніцтва гуткамі прыцягваюцца лепшыя агітатары заводаў і ўстаноў. Для таго, каб кіраўнікі гурткоў добра самі вывучылі выбарчы закон, з імі будуць праводзіцца семінары. Першы семінар адбыўся 1 кастрычніка. Усе гурткі будуць працаваць па спецыяльна выпрацаванай праграме.

ФРАЛОЎ.

Р. ВОЛЬСКІ

Да выбараў у Вярхоўны Совет СССР

ПАРАДАК ГАЛАСАВАННЯ

Падача галасоў і зазначэнне вынікаў выбараў ёсць апошні этап выбараў. Калі кандыдаты выстаўлены і зарэгістраваны, спісак кандыдатаў на кожнай выбарчай акрузе ў Совет Саюза і ў Совет Нацыянальнасцей апублікован, — наступае момант, калі грамадзяне прыступаюць да падачы галасоў.

У перыяд паміж выстаўленнем кандыдатаў і днём галасавання ідзе ажыўленая агітацыя за таго ці іншага кандыдата, агітацыя па растлумачэнню велізарнага значэння выбараў у Вярхоўны Совет СССР для ўсяго нашага народа, для ўсіх працоўных свету: агітацыя, якая мабілізуе ўсіх зыбаршчыкаў СССР выканаць свой абавязак совецкага грамадзяніна і з'явіцца ў дзень выбараў у памяшканне свайго выбарчага ўчастка для падачы голасу за самага вартага з кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР.

Дзень выбараў — адзіны для ўсяго Саюза Совецкіх Социялістычных Рэспублік, устанаўліваецца Прэзідыумам Вярхоўнага Совета СССР, а да выбрання такога — Прэзідыумам ЦВК СССР. Выбары назначаюцца ў нерабочы дзень. Магчыма, што такім днём будзе агульнавыходны дзень, які прыпадае на нядзелю. Тэрмін выбараў устанаўліваецца не пазней чым за 2 месяцы да дня выбараў.

Падача галасоў за кандыдатаў у дэпутаты абодвух палат Вярхоўнага Совета СССР, г. зн. у Совет Саюза і ў Совет Нацыянальнасцей, праходзіць у адзін і той-жа дзень, у адзін і той-жа час, у адным і тым-жа памяшканні. Прыём выбарчых бюлетэняў ад выбаршчыкаў будзе праводзіцца на працягу 18 гадзін — з 6 гадзін раніцы да 12 гадзін ночы дня выбараў. У буржуазных краінах тэрмін падачы галасоў звычайна не перавышае 12 гадзін. Наш выбарчы закон устанавіў больш працяглы тэрмін, для таго, каб кожнаму выбаршчыку прадаставіць магчымасць выбраць самы зручны для сябе час для падачы голасу.

У памяшканні для выбараў з моманту пачатку галасавання ідзе толькі падача выбарчых бюлетэняў. Выбарчая агітацыя ў памяшканні для выбараў не дапускаецца.

У памяшканні для галасавання абавязкова захаванне поўнага парадку і дысцыпліны. Кожны выбаршчык мае доступ у гэтае памяшканне свайго ўчастка, бо выбары праводзяцца публічна, — усякі выбаршчык можа ўласнымі вачыма пераканацца, што выбары праходзяць у поўнай адпаведнасці з патрабаваннямі Сталінскай Канстытуцыі і «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР». Старшыня Ўчастковай выбарчай камісіі нясе адказнасць за парадак у выбарчым памяшканні, яго распараджэнні для ўсіх прысутных абавязковы.

У дзень выбараў старшыня Ўчастковай выбарчай камісіі і ўсе яе члены абавязаны з'явіцца ў памяшканне для выбараў загадзя і ў 6 гадзін раніцы адкрыць пасяджэнне камісіі. Перш за ўсё, старшыня Ўчастковай выбарчай камісіі ўпаўнаважаецца на вачах у членаў камісіі, што выбарчыя скрынкі пусты і ў поўнай прыгоднасці, што ў іх нічога няма. Затым скрынкі зачыняюцца і апячатваюцца пячаткай камісіі, пасля чаго старшыня Ўчастковай выбарчай камісіі запрашае выбаршчыкаў прыступіць да падачы галасоў.

Падача галасоў і работа Ўчасткозай выбарчай камісіі павінны праходзіцца бесперапынна да сканчэння падліку галасоў, паданых у даным участку. На працягу ўсяго гэтага часу абавязкова пастаянная прысутнасць больш паловы агульнага ліку членаў Ўчастковай выбарчай камісіі.

Выбаршчык павінен ажыццявіць сваё права асабіста. Для падачы голасу ён павінен асабіста з'явіцца ў памяшканне для галасавання і асабіста апусціць сёй выбарчы бюлетэнь у выбарчую скрынку.

«Палажэнне аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР» вызначае ўпарадкаванне памяшкання для выбараў. Яно складаецца па крайняй меры з 2-х пакояў: з пакоя, у якім засядае Ўчастковая выбарчая камісія і з пакоя для запаўнення бюлетэняў. Калі ў пакой для запаўнення бюлетэняў будзе дапускацца адначасова некалькі выбаршчыкаў, у ім павінны быць загадзя зроблены перагародкі ці пастаўлены шырмы адпаведна ліку асоб, адначасова дапускаемых для запаўнення бюлетэняў. Такое мерапрыемства неабходна для таго, каб абараніць тайну галасавання. Таму зрабіць перагародкі ці шырмы трэба так, каб ніхто не мог бачыць, як выбаршчык запаўняе свае бюлетэні.

У пакой для запаўнення бюлетэняў ці ў адгароджаную (перагародкай ці шырмай) частку пакоя можа быць дапушчан адначасова толькі адзін выбаршчык, бо ніхто не мае права прысутнічаць пры запаўненні бюлетэняў (у тым ліку і члены Ўчастковай выбарчай камісіі). Выключэнне з гэтага правіла дапускаецца толькі для выбаршчыкаў, якія з прычыны непісьменнасці ці якога-небудзь фізічнага недахопу не маюць магчымасці самі запоўніць бюлетэні, — ім прадастаўлена праза запрашаць у пакой, дзе запаўняюцца выбарчыя бюлетэні, любога другога выбаршчыка для дапамогі ў запаўненні выбарчых бюлетэняў.

Выбарчы закон не ставіць асобых умоў для афармлення выбарчага памяшкання. Аднак, зусім ясна, што памяшканне, у якім праходзіць важнейшы і сур'ёзнейшы дзяржаўны акт, якім з'яўляюцца выбары ў дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР, павінна быць зручным, культурна абсталёваным і т. д.

Як-жа праходзіць сам працэс падачы галасоў?

I. З'явіўшыся ў выбарчае памяшканне, выбаршчык падыходзіць да сакратара Ўчастковай выбарчай камісіі і прад'яўляе яму пашпарт або калгасную кніжку, або прафсаюзны білет, або іншае пасведчанне асобы. Выбаршчыкі, прыбыўшыя з іншага выбарчага ўчастка з «пасведчаннем на права галасавання», прад'яўляюць адно з вышэй пералічаных пасведчанняў асобы, а таксама «пасведчанне на права галасавання».

II. Сакратар Ўчастковай выбарчай камісіі правярае прад'яўленае яму выбаршчыкам пасведчанне асобы.

адзначае ў спіску выбаршчыкаў яўку выбаршчыка супроць яго прозвішча і

выдае яму выбарчыя бюлетэні і канверт устаноўленага ўзору.

Выбаршчык, з'явіўшыся ў выбарчае памяшканне з «пасведчаннем на права галасавання», заносіцца сакратаром у асобны спісак выбаршчыкаў (які далучаецца да асноўнага спіска выбаршчыкаў), пасля чаго яму выдаюцца бюлетэні і канверт.

III. Выбаршчык, атрымаўшы бюлетэні і канверт,

ідзе ў пакой для запаўнення бюлетэняў,

заходзіць за сваёдную перагародку ці шырму, дзе без сведкаў, нікім не назіраемы і не кантралюемы,

выкрэслівае ў атрыманых ім бюлетэнях прозвішчы кандыдатаў, за якіх ён не галасуе, пакідаючы незакрэсленым прозвішча толькі таго кандыдата ў дэпутаты, за якога ён хоча падаць свой голас, затым

укладвае бюлетэні ў канверт,

заклейвае яго,

пераходзіць назад, у пакой, у якім засядае Ўчастковая выбарчая камісія, і

асабіста апускае канверт з выбарчымі бюлетэнямі ў выбарчую скрынку.

У часе падачы і падліку галасоў сакратар Ўчастковай выбарчай камісіі вядзе пратакол пасяджэння Ўчастковай выбарчай камісіі. У яго заносяцца ўсе выпадкі, калі выбаршчык не быў дапушчан да галасавання, і ўказваецца прычына гэтага. У пратакол заносяцца заявы і скаргі выбаршчыкаў на дзеянні Ўчастковай выбарчай камісіі і рашэнні, прынятыя па гэтых заявах і скаргах.

Роўна ў 12 гадзін ночы закрываецца доступ у выбарчыя памяшканні, і пасля таго, як паданы былі галасы выбаршчыкаў, якія аставаліся пры закрыцці выбарчага памяшкання, Ўчастковая выбарчая камісія прыступае да падліку галасоў.

Для галасавання кожны выбаршчык атрымлівае выбарчыя бюлетэні і канверт устаноўленага ўзору і колеру. Сапраўднымі пры падліку галасоў прызнаюцца толькі выбарчыя бюлетэні, якія адпавядаюць патрабаванням закона і паданы ў канвертах устаноўленага ўзору.

Для чаго ўстаноўлены такія правілы адносна выбарчых бюлетэняў і канвертаў? Ці не прасцей было-б прадаставіць кожнаму выбаршчыку пісаць прозвішча кандыдата на якой заўгодна паперы, укладваць бюлетэні ў любы канверт і т. д.

Галоўная падстава, чаму нельга так рабіць, ёсць неабходнасць ахоўваць замацаванае ў Канстытуцыі СССР тайнае галасаванне. Таму «Палажэнне аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР» прадпісала, каб Цэнтральная выбарчая камісія ўстанавіла форму і колер выбарчых бюлетэняў і канвертаў для іх. Выбарчыя бюлетэні па кожнай выбарчай акрузе павінны быць такія, каб па знадворнаму выгляду, г. зн. па тэксту, па размеру, колеру і якасці паперы, — яны нічым адзін ад аднаго не адрозніваліся. Дасягнуць поўнай адноль-кавасці выбарчых бюлетэняў зручней за ўсё такім шляхам, каб яны загатаўліваліся адным і тым-жа органам.

«Палажэнне аб выбарах» устанавіла, што Ўчастковыя выбарчыя камісіі забяспечваюцца выбарчымі бюлетэнямі адзіначнай Акруговай па выбарах у Совет Саюза выбарчай камісіяй і Акруговай па выбарах у Совет Нацыянальнасцей выбарчай камісіяй. Далей, тайну галасавання лёгка раскрыць і ў тым выпадку, калі выбаршчыкі будуць карыстацца неадпаведнымі канвертамі. Таму «Палажэнне аб выбарах» цалкам правільна ўстанавіла, што і канверты павінны адпавядаць устаноўленаму Цэнтральнай выбарчай камісіяй узору.

Выбаршчыкі павінны помніць, што ў выбарчым бюлетэні трэба пакінуць незакрэсленым толькі прозвішча таго кандыдата ў дэпутаты, за якога яны галасуюць. Калі-ж у бюлетэнях пакінуць незакрэсленымі два ці больш прозвішч, то робіцца незразумелым, за якога з кандыдатаў выбаршчык галасуе. Такія выбарчыя бюлетэні з'яўляюцца несапраўднымі, яны не будуць прымацца пад увагу пры падліку галасоў.

«Палажэнне аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР» самым пільным і патрабазнейшым чынам рэгламентуе парадак галасавання. У такой важнай справе, як выбары вярхоўнага органа ўлады, ні адно дадатковае патрабаванне закона, ні адна деталь не з'яўляецца лішняй, калі яна садзейнічае большай гарантыі ўсеагульнага, прамога, роўнага і тайнага галасавання.

Што ўсякае пытанне тэхнікі выбараў набывае выключнае палітычнае значэнне, вельмі добра відаць з вопыту выбараў у буржуазных краінах. Няма чаго і таварыць пра «выбары» ў фашысцкіх краінах, дзе «галасаванне» суправаджаецца такім разгулам тэрору ў адносінах да ўсіх інакшмыслячых і незадаволеных фашысцкім рэжымам, што «выбары» ў гэтых краінах з'яўляюцца гнусным і зверскім ашуканствам і здзекам з народных мас. Але і ў буржуазных дэмакратычных краінах тэхніка выбараў і галасавання такая, што астаюцца шматлікія лазейкі для скажэння волевыяўлення выбаршчыкаў, для парушэння тайны галасавання, для націску на выбаршчыкаў, для подкупу, шантажа і пагроз па адрасу выбаршчыкаў.

Наш выбарчы закон стаіць на зарпе поўнай выбаршчыка. Ясна і дакладна ўстанаўлівае ён парадак галасавання, гарантуючы кожнаму выбаршчыку яго правы, прадастаўленыя яму Сталінскай Канстытуцыяй—хартыяй социялістычнага дэмакратызма.